№№171–172
(3508–3509)

9 лістапада 2011 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

www.nv-online.info

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Мясніковіч даў заданне

Золатавалютныя рэзервы Беларусі ў 2012 годзе павінны прырасці мінімум на 5 млрд долараў, у асноўным за кошт даходаў ад прыватызацыі.

Аб гэтым заявіў учора на пасяджэнні Савета міністраў прэм'ер-міністр Беларусі **Міхаіл Мясніковіч,** перадае БЕЛТА.

АКТУАЛИИ

Светлана КАЛИНКИНА

Игры в патриотов

Пока большинство белорусов тихо уминали шкварку, запивая чарочкой, власть, похоже, начала готовиться к войне. Кое-кто не скрывает, что оперативно сделаны выводы из судьбы Муаммара Каддафи и наша страна при необходимости готова будет дать отпор.

Председателям облисполкомов уже выдали форму и генеральские погоны. Дано строгое указание на посты в "вертикали" подбирать людей военных. Глава государства прямо озвучил грандиозные планы по созданию настоящего народного ополчения, армии нового типа.

Нет сомнения, что главнокомандующий искренне верит в победу, потому что "потенциальный противник" уже сейчас о-го-го как оценивает нашу военную мощь. По крайней мере, если верить "комиссарам". И тем докладам, которые кладут на стол Александру Лукашенко. Но вот если не быть "крупным военным стратегом", то следует признать, что эти игры в патриотов выглядят, мягко говоря, неуместными.

Во-первых, сегодня войны не ведутся против стран. Они ведутся либо против террористов, либо против диктаторов.

Во-вторых, гонка вооружений давно признана успешной стратегией "бескровной победы". Особенно в ситуации, когда экономика "потенциального противника" и так на износе.

Ну и наконец в-третьих, даже самые современные танки сами по себе не воюют. Воюют люди. И для эксплуатации их лучших патриотических чувств, так необходимых для победоносной войны, больше трех мотиваций человеческая история придумать не сумела. В едином патриотическом порыве люди воюют только "за веру, царя и Отечество".

На веру нашу, слава Богу, никто не покушается.

Воевать за царя — это, к большому сожалению современных комиссаров, давно моветон. Хотя бы потому, что в цари мы себе никого не выбирали, никого царем не назначали, полномочий таких никому не давали. Да и серьезный идеологический подрыв под лозунг "воевать за монарха" был осуществлен еще во времена Французской революции. Слишком много времени прошло, чтобы повернуть сознание людей вспять. Потому воевать за царя сегодня могут только наемники и только за большие деньги (что, кстати, доказал опыт Ливии).

Таким образом, гипотетический лозунг для мобилизации нашего народа остается только один — воевать за Отечество. И вот тут белорусский опыт может стать особо показательным, в назидание всем.

Последние семнадцать лет власти целенаправленно уничтожали идентификацию белорусов как самодостаточной нации с достойным историческим прошлым, в нас нивелировали, размывали само понятие Отечества. Белорусов учили думать не о порядке и благополучии в собственном доме, а мыслить масштабами от Венесуэлы до Китая, жить проблемами и Ближнего Востока, и Дальнего. Нам рассказывали, что на белорусском языке ничего великого не написано; что наши исторические символы — это символы предателей и полицаев; что лучший вождь для страны — тот самый, который говорит: "Я свой народ за цивилизованным миром не поведу..." И так далее, и тому подобное. Одновременно патриотов, тех, кто не соглашался с такой политикой и с таким вождем, кто все эти годы пытался донести до людей, что Беларусь не началась с Лукашенко и им не закончится, что у белорусов не может и не должно быть комплекса исторической неполноценности, объявили "пятой колонной", врагами народа. Их клеймили позором, их выживали из страны, их сажали в тюрьмы...

Итог такого "патриотического воспитания" мы имеем сегодня. Он уже проявился, уже понятен. И хотя нынешние времена мы часто сравниваем с советскими, но в главном нынешняя Беларусь от Советского Союза уже отличается. Так, правильно воспитанные советские мальчики умели правильно мечтать. По-разному складывались их судьбы, и советские методики промывания мозгов многих морально покалечили, но, по крайней мере, на старте жизни правильные, в патриотическом духе воспитанные советские школьники мечтали о высоком. Они готовы были ехать поднимать целину, строить БАМ, они хотели быть летчиками или космонавтами... Хотя бы детские мечты у них были достойными — о небе, солнце, свободе, полете, масштабе, просторе...

Итог "правильного патриотического воспитания" белорусских подростков — отвратительный. Современных белорусских мальчиков, готовых надеть погоны и посвятить себя службе Родине, небо не манит. Свои первые шаги по взрослой жизни они, наоборот, сознательно делают в сторону... тюрьмы. И это не литературный образ, это зафиксированный факт. Так, уже не первый год конкурс абитуриентов, желающих поступить на факультет внутренних войск Военной академии, не просто выше, а почти в два раза выше, чем на авиационный факультет.

Какое небо?! Зачем полет пацанам, воспитанным белорусской действительностью?! Всевластие — вот что сейчас составляет для них истинный образец для подражания.

К нашему стыду, и проходной балл у будущих тюремщиков тоже выше, чем у летчиков. И это значит, что за последние семнадцать лет выросло поколение, которое не по нужде, а по призванию, по зову души и сердца хочет быть надзирателями и конвоирами, идет работать именно в тюрьмы.

Или другой пример. Общевойсковой факультет той же Военной академии. Здесь самые высокие проходные баллы, конечно же, на самую "героическую" из всех возможных военных специальностей — на "тыловое обеспечение". Бензин для танков подвозить — это для пацанов, воспитанных в Беларуси времен Лукашенко, и есть самая большая романтика, самое большое геройство. И удивляться тут нечему: кого растили — того и вырастили. Другое непонятно: во главе какой армии главнокомандующий может пойти в бой?.. Во главе армии из тыловиков и заградотрядов?..

Он вообще понимает, на каких примерах воспитана его будущая армия? На каких книжках, на каких сказках, на каких образцах для подражания росли эти дети, если в итоге выбирают себе профессии надзирателей и тыловиков?..

За такую идеологическую диверсию, за такую дискредитацию самого понятия патриотизма надо не давать, а срывать генеральские погоны. И страшно это все, и стыдно.

БАМОНД

«Лістапад» за зачыненымі дзвярыма?

Погляды не толькі мужчын, але і жанчын на адкрыцці кінафестывалю "Лістапад" былі прыкаваныя да адной з самых прыгожых актрыс расійскага кінематографа Вольгі Кабо.
Ёй цалавалі ручкі і рабілі кампліменты... *(Фота photo.bymedia.net)*

(Працяг тэмы "Лістапада" — на 7-й паласе.)

Аляксандра Малчанава зноў пасадзяць?

Барысаўскі актывіст Аляксандр Малчанаў, які быў асуджаны за ўдзел у мітынгу 19 снежня і правёў за кратамі 9 месяцаў, ізноў апынуўся пад увагай праваахоўных органаў. На гэты раз Малчанава падазраюць у абразе дзяржаўных сімвалаў.

Аляксандра Малчанава затрымалі ноччу 27 кастрычніка ў двары дома. Па версіі міліцыянераў, малады чалавек стварыў у тую ноч аварыйную сітуацыю. Нібыта пры затрыманні Малчанаў не падпарадкаваўся патрабаванням супрацоўнікаў праваахоўных органаў і лаяўся матам. Дзіўным выглядае той факт, што Малчанаў стварыў аварыйную сітуацыю ў гадзіну ночы *ў двары дома* і там у гэты час апынуліся міліцыянеры.

У гэты ж дзень, 27 кастрычніка, суддзя суда Барысаўскага раёна спадар Герасімовіч вынес рашэнне: Аляксандр Малчанаў вінаваты ў непадпарадкаванні супрацоўнікам міліцыі. Актывіста адправілі за краты на дзесяць сутак.

Тэрмін зняволення Аляксандра Малчанава павінен быў скончыцца 6 лістапада. Аднак на волю малады чалавек не выйшаў. Высветлілася, што 26 кастрычніка невядомымі ў самым цэнтры Барысава былі залітыя чорнай фарбай дзяржаўныя сцягі. Пад падазрэнне трапілі Аляксандр Малчанаў і Андрэй Мікалаеўскі. Тэрмін утрымання Малчанава пад вартай працягнулі на трое сутак. Заканчваецца ён якраз сёння. І сёння стане зразумела, ці прад'явяць яму афіцыйнае абвінавачанне па 370-м артыкуле Крымінальнага кодэкса Беларусі — "Знявага дзяржаўных сімвалаў".

Адзначым, што ў доме Аляксандра Малчанава быў праведзены ператрус, падчас якога быў канфіскаваны камп'ютар актывіста.

Нагадаем,14 верасня Малчанаў выйшаў на свабоду пасля памілавання Аляксандрам Лукашэнкам. Барысаўскі актывіст быў асуджаны на тры гады пазбаўлення волі за "ўдзел у масавых беспарадках" 19 снежня. І вось зараз яму пагражае новы крымінальны пераслед.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

Са снежня талончык будзе каштаваць 1600 рублёў?

А праезд у метро мінскія транспартнікі хочуць павялічыць да 1800 рублёў за адну паездку.

Пра неабходнасць чарговага павышэння платы за праезд дырэктар ГУ "Сталічны транспарт і сувязь" **Валерый Шкуратаў** абгрунтаваў пастаянным ростам тарыфаў на ўсе складнікі выдаткаў пасажырскага транспарту сталіцы — электра- і цеплаэнергію, эксплуатацыю транспарту ў зімовы перыяд, якія ў апошні час павялічыліся больш чым удвая.

Ён адзначыў, што сёння сабекошт праезду ў грамадскім транспарце складае 2900 рублёў за адну паездку.

Як вядома, 1 лістапада кошт талончыка ўжо павысіўся з 950 да 1300 рублёў.

Спрэчкі вакол 110 тысяч тон нафты

Латгальскі акруговы суд Латвіі прызначыў на 24 лістапада разгляд іску ААТ "Полацктранснафта Дружба" аб спрэчнай нафце ў нафтаправодзе Полацк—Вентспілс.

Размова ідзе аб праве ўласнасці на 110 тысяч тон тэхналагічнай нафты, якая знаходзіцца ў магістральным нафтаправодзе Полацк—Вентспілс і належыць беларуска-латвійскай кампаніі "ЛатРасТранс". Нафтаправод не выкарыстоўваецца са студзеня 2004 года.

КАДРЫ

Знайшлі партфелі

У аўторак прэс-служба прэзідэнта паведаміла пра шэраг кадравых указаў. Самым доўгачаканым рашэннем стала змена пасла Беларусі ў Расіі.

Замест **Васіля Далгалёва** ў расійскую сталіцу накіроўваецца былы віцэ-прэм'ер, а апошнім часам — намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта па эканамічных пытаннях — **Андрэй Кабякоў.** Нагадаем, што Кабякоў — масквіч па нараджэнні, хаця доўгі час жыў і працаваў у Беларусі. У Маскве ён мае трывалыя карані — і сяброў, і сваякоў, і кватэру. Таму, як прызнаваўся Аляксандр Лукашэнка, яму выбар такой кандыдатуры "не раілі"...

Тым не менш прызначэнне адбылося. Адначасова Кабякоў прызначаны Пастаянным прадстаўніком Беларусі пры Еўразійскім эканамічным саюзе па сумяшчальніцтве.

Акрамя таго, па даных прэс-службы, **Уладзімір Лапата-Загорскі** стаў амбасадарам Беларусі ў Індыі, **Андрэй Моўчан** — у Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы, **Сяргей Рахманаў** — у Японіі, **Аляксандр Сямешка** — у Каралеўстве Бахрэйн (па сумяшчальніцтве).

Дачакаўся прызначэння і былы кіраўнік Службы аховы прэзідэнта, былы дзяржаўны сакратар Савета бяспекі, яшчэ пазней — кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта — **Генадзь Нявыглас**. Нявыглас застаўся без пасады аж у 2008 годзе і фактычна з таго часу чакаў новага сур'ёзнага прызначэння. Пару месяцаў таму ён даў знак, што збіраецца, нарэшце, вызваліць крэсла старшыні Федэрацыі футбола Беларусі, бо вяртаецца на дзяржаўную службу. Але пра якую канкрэтна службу ішла размова, да апошняга было не зразумела. Нарэшце, яснасць ёсць. Нявыглас прызначаны намеснікам дзяржсакратара Арганізацыі дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ).

Аляксандр Лукашэнка таксама даў згоду на прызначэнне:

ШАГУНА Анатоля Васільевіча — намеснікам міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі,

УЦЮПІНА Паўла Уладзіміравіча — намеснікам міністра прамысловасці,

ЕРМАЛОВІЧА Максіма Леанідавіча — намеснікам міністра фінансаў,

КУРЭННАГА Уладзіміра Пятровіча — старшынёй Шумілінскага райвыканкама,

ПАНФІЛАВА Юрыя Анатольевіча — кіраўніком адміністрацыі Чыгуначнага раёна г. Віцебска,

ДЫМШЫ Юрыя Аляксеевіча — старшынёй Глускага райвыканкама,

КАРЛЮКЕВІЧА Аляксандра Мікалаевіча — галоўным рэдактарам газеты "Звязда".

СКАНДАЛ

Анатоль Буяльскі не патрэбен зборнай?

Галоўны трэнер жаночай зборнай Беларусі па баскетболе Анатоль Буяльскі не збіраецца працягваць работу з камандай.

Нагадаем, што менавіта пад кіраўніцтвам Анатоля Буяльскага беларуская зборная дасягнула проста ўнікальных вынікаў у апошнія гады. Ніводная нацыянальная каманда Беларусі па гульнявых відах спорту не можа такімі вынікамі пахваліцца і блізка. Мяркуйце самі: бронзавыя медалі на чэмпіянаце Еўропы 2007 года, удзел у Алімпіядзе-2008, 4-е месца на чэмпіянаце свету-2010...

9 лістапада зборная накіроўваецца ў Турцыю, дзе правядзе матч Еўракубка, але Анатоль Буяльскі распавядае "Народнай Волі", што са сваім рашэннем ужо вызначыўся.

— Вырашыў пакінуць пасаду галоўнага трэнера адназначна, можа быць, гэта заставіць кагонебудзь задумацца, — кажа Анатоль Сяргеевіч. — Каманда не заслугоўвае такога стаўлення да сябе. Аднак пакуль нешта канкрэтызаваць не хачу, трэба дачакацца пасяджэння выканкама Федэрацыі баскетбола, якое адбудзецца 10 лістапада.

— Кантракт у вас да 31 снежня. Можа, яшчэ зменіце сваё рашэнне?

— Я вельмі ў гэтым сумняваюся.

На пытанне аб сваім магчымым пераемніку Анатоль Буяльскі падпусціў шпільку ў бок федэрацыі: "Кіраўніцтва федэрацыі ў нас зараз самастойнае, яно ўсё вызначае само. Ведае, да чаго трэба ісці і як патрэбна працаваць".

У бліжэйшых нумарах мы больш падрабязна распавядзём аб гэтай сітуацыі. Пакуль жа можна сказаць, што гэта самы сапраўдны нонсэнс, калі такія спецыялісты застаюцца ў краіне незапатрабаванымі.

Алесь СІВЫ.

ТЕМА ДНЯ

Народный сход как форма самоорганизации граждан

Резкое снижение доходов, ценовой шок и призывы "еще потерпеть" — ввиду отсутствия реальных путей выхода из кризиса. Вот чем власть одарила "послушного и терпеливого" беларуса в благодарность за то, что он не пришел на Народный сход 8 октября.

Репрессиями в отношении организаторов Народных сходов и запугиванием граждан — их потенциальных участников власть продемонстрировала, что не готова к диалогу ни с обществом, ни с оппозицией, не готова открыто заявить народу о проблемах и совместно искать выход из трудной ситуации. Как оказалось, для нее такой подход вообще неприемлем.

Но несмотря на репрессии и запугивание, 8 октября Народные сходы прошли в 13 городах Беларуси: Минске, Витебске, Могилеве, Гомеле, Бресте, Вилейке, Слуцке, Полоцке, Новополоцке, Бобруйске, Барановичах, Слониме и Орше. В них приняло участие более 4 тысяч человек. На сходах были приняты резолюции с требованиями граждан к властям. Избранные на народных сходах представители передали эти резолюции в Совет Министров Беларуси и исполкомы соответствующих городов.

Во всех резолюциях содержались требования:

- остановить рост цен,
- индексировать зарплаты, пенсии, стипендии и денежную помощь в соответствии с ростом цен, а рублевые вклады населения — в соответствии с курсом белорусского рубля на 1 января 2011 года,
- обеспечить гражданам возможность свободно покупать валюту и возвращать кредиты в белорусских рублях,
- отменить систему краткосрочных принудительных контрактов,
- стимулировать хозяйственную инициативу и предоставить возможность предпринимателям создавать новые рабочие места,
- освободить и полностью восстановить в гражданских правах всех политзаключенных,
- провести новые свободные выборы президента и парламента.

Кроме этих во многих городах были включены пункты, содержащие требования решать насущные местные проблемы.

Рост социальной напряженности и нарастание кризиса в государстве и обществе требуют новых форм самоорганизации людей. Гражданская кампания "Народный сход" имеет все шансы стать реальной, действительно народной альтернативой дискредитировавшей себя власти.

В сентябре 2011 года независимыми социологами проведен опрос об отношении к Народному сходу. 14,1% ответили "одобряю и приму участие в этой инициативе", 47,4% — "одобряю, но не приму участия", не одобряющие и безразличные оказались в меньшинстве (13% и 21,3%). Это говорит о народной поддержке идеи сходов. Но поддержка на словах, как видим, еще не означает действенного участия.

Поэтому сегодня важно не останавливаться, не отступать или выжидать, а всеми силами продолжать и развивать кампанию "Народный сход". Сейчас необходимо:

- максимально широко распространять информацию о тех требованиях к власти, которые выдвинуты на Народных сходах 8 октября;
- проводить Народные сходы можно (в том числе и 12 ноября) в самых разных местах, которые предназначены для публичных мероприятий.

На этих локальных Народных сходах надо принимать резолюции в поддержку требований, принятых 8 октября (с указанием количества участников схода и тех требований, которые они пожелают добавить), выбирать своих представителей и направлять их в оргкомитет Народного схода своего города.

И когда количество участников локальных сходов достигнет 10% от жителей города, их представители смогут смело принять решение о проведении общегородского Народного схода, зная, что на этот раз людей выйдет столько, что власть вынуждена будет считаться с ними не так, как 8 октября.

Оргкомитеты Народных сходов открыты для любого гражданина Беларуси, независимо от национальности, вероисповедания, идеологии и партийной принадлежности.

- Если Вы считаете, что наша страна движется в неправильном направлении и в кризисе виновата власть,
- если Вы не собираетесь бежать из Беларуси и хотите нормально жить у себя дома,
- если Вам надоело бесконечное вранье телевидения и чиновников,
- если Вы не хотите больше терпеть издевательства и унижения от маленьких и больших начальников,
- если Вы поддерживаете требования к власти, принятые Народными сходами — выходите на связь и присоединяйтесь к нашей работе.

Давайте вместе менять жизнь к лучшему!

КООРДИНАЦИОННЫЙ СОВЕТ ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ НАРОДНЫХ СХОДОВ БЕЛАРУСИ

Контакты Координационного совета представителей Народных сходов Беларуси:

http:www.narodnyshod.org
220013, ул.Кульман, 4, Белорусский профсоюз работников РЭП
Телефоны: +375172924651, +375172844187, +375173313331, +375297744968, +375447160622, +375296815737, +375259514003.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
9 ЛІСТАПАДА 2011 г.

СІТУАЦЫЯ

Бунт у Мінску

Жыхары сталічнага завулка Розы Люксембург абвінавачваюць мясцовую ўладу ў тым, што яна бароніць інтарэсы бізнес-заказчыкаў, а не шараговых гараджан, якія хочуць захаваць зялёныя лапікі зямлі, яшчэ не кранутыя сучаснай архітэктурай.

Святлана Мікалаеўна Пазняк (Лапіцкая) і яе пажыццёвы абярог — дуб-велікан.

Стогадовы дуб — можа, самы стары ў Мінску — укленчвае да людзей: "Мяне хочуць забіць!.." Разам з векавым дубам, поўным моцы і характва, кленчаць і жыхары дома №4 па Другім завулку Розы Люксембург беларускай сталіцы, таго самага дома, паблізу якога і стаіць разлапісты, але падранены волат. Месцічы літаральна бамбардзіруюць лістамі-скаргамі Мінгарвыканкам, Дзяржкантроль, Мінскі гарадскі камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, адміністрацыю Маскоўскага раёна, Адміністрацыю Лукашэнкі. Іх турбуе не толькі лёс векапомнага, у два абхваты дрэва, але і свой уласны лёс: неўзабаве месцічы пазбавяцца адзінага зялёнага лапіка зямлі, які быў для іх усім — месцам адпачынку, крынічкай чыстага паветра, шатром ад сонечнай спёкі, натуральным фільтрам ад аўтамотасмуроду... На гэтай дзівоснай зялёнай выспе, абкружанай з усіх бакоў дубамі, клёнамі, бярозамі, мамы люлялі сваіх немаўлят, а гарэзы гулялі ў хованкі, разведчыкаў і "Чалавека-павука"... Тут ва ўсе часы і ўсім было добра — старым, маладым, дзецям. І раптам усяго не стала, амаль усяго... У адзін момант прыродны ландшафт, акультураны мазолістымі рукамі папярэднікаў, быццам зачах, асірацеў, скукожыўся да непазнавальнасці. Як жа так?!

"А вельмі проста, — патлумачыла мне адна з "бунтаўшчыц" **Тамара Уласаўна Спіжарная**, — *у сярэдзіне кастрычніка наш, так бы мовіць, міні-дэндрапарк нейкая навалач абгарадзіла плотам, а ўсе дрэвы... спілавалі. Сказалі, што тут будзе аўтастаянка, а крыху далей — побач з будынкам райвыканкама і ў непасрэднай блізкасці ад нашага дома — вышынны дом пад офісы... Знакаміты дуб — краса раёна — на шчасце, не ўвайшоў у будаўнічую пляцоўку. За якія два метры па другі бок плота апынуўся... Але што вы думаеце?! 21 кастрычніка была спроба спілаваць і яго. Рабочыя паспелі зрэзаць дзве таўшчэзныя галіны: сукі такія, што ствалы некаторых дрэў не параўнаюцца... Ну, тут наша гаспадарства і падняло лямант, не дало разагнацца забойцам. Але ж не здолелі адстаяць іншыя, пладовыя, дрэвы. Спілаванымі аказаліся ў тым ліку і старыя вішні, і яблыні, і стогадовая груша, якая пладаносіла кожны год. Пад пілу пусцілі і больш маладыя дрэвы ды кусты, пасаджаныя намі 25 год таму. А дрэвы былі здаровымі, па пнях відаць... Цяпер толькі на няцотным баку Мацвееўскага завулка колькі дрэў і засталося... Карацей, гора нам".*

На абкарнаным мурожным лужку, скрозь усыпаным сухім, як пергамент, дубовым лісцем, — гола, пуста, адно галінне на доле тырчыць, коле неба і вочы. Увагу прыцягнула невысочанькая жанчына сталага ўжо веку. Хударлявай постаццю прытулілася да дубовага камля і так далікатна-далікатна, быццам жывое (а яно так і ёсць), гладзіць далонню пparticle рэпаную ад часу, каструбаватую, але прыемную на дотык кару дуба. Нешта нячутнае шэпча, быццам малітву перад абразом... Падыходжу і спакваля, не парушаючы патаемнага, тулюся сам да ўладара ўсіх дрэў. Кажуць, дуб сілкуе жыццёвай энергіяй, аддае, а не забірае моц... *"Яно так,* — пагаджаецца жанчына, — *у яго моцы столькі, што і для людзей не шкада... Але і да яго трэба з добрым сэрцам, а не са злым. Інакш усё дарэмна, інакш горш сабе..."*

— Вы, мусіць, з чацвёртага дома? — пытаюся.

— Не, — адказвае, — я цяпер далей жыву, у іншым раёне. Але гэты куточак — мой, радзімны. Прыязджаю сюды часта, з унукам Міхаськам. Бывае занядужаю, а ён за сваё: паехалі, бабуля, на дзедаву сялібу, да нашага дуба.

— Выходзіць, тут вы жылі? І як жа вас завуць, добрая спадарыня?

— **Святлана Мікалаеўна Пазняк** я, а ў дзявоцтве была Лапіцкая, — кажа, — а гэты пляачык зямлі быў некалі нашым, Лапіцкім. Дзядуля мой купіў яго ў 1911 годзе, у мяне і купчая захавалася. З тае пары тут наша сяліба. Нарадзілася тут, гадавалася пад гэтым дубам, і замуж выходзіла. Сям'я ў нас вялікая была, дружная. А дуб гэты як усё роўна засцерагаў нас... І ўсю Мацвееўскую вуліцу, усіх месцічаў. Ён сам перажыў рэвалюцыю, войны-акупацыі і нас засцярог. Тата мой, Мікалай Пятровіч, мог колькі разоў трапіць у гестапа, загінуць, але дзякаваць Богу і нашаму абярогу — дубу-волату...

— Значыцца, тата быў падпольшчыкам?

— Так, прычым удзельнікам той першай хвалі падпольнага змагання, якая амаль цалкам загінула. Я скажу вам болей таго. Тут, ля гэтага дуба, быў і апошні тайнік падпольшчыкаў, дзе тата хаваў перададзеныя яму камандзірам групы Нікіфаравым дакументы. Нікіфарава гестапаўцы схапілі і закатавалі ў засценках, а дакументы ўжо пасля вайны тата перадаў органам. Яго яшчэ доўга цягалі ў тое КДБ, распытвалі... Вось я і трымаю ў руках кніжку аўтара Дамарада, дзе ўсё мінулае апісана, і пра майго бацьку таксама... Дуб наш — жывы сведка падзей, можна сказаць, частка гісторыі.

...Мінулай пятніцай у актавай зале райвыканкама адбывалася сустрэча розных чыноўнікаў з насельнікамі дома №4. Вырашалі, хто ж мае рацыю ў гэтай заблытанай справе з будаўніцтвам аб'екта амаль пад самымі вокнамі жылога дома, ці законнае яно і ці не парушаны тэхнічныя рэгламенты. Аказалася, што будучая аўтастаянка — гэта часовая парковачная пляцоўка на шэсцьдзясят з гакам машынамесцаў і што аб'ект гэты — усяго толькі частка вялікага праекта, які мае на мэце ўзвядзенне не толькі вышыннага офіснага будынка з падземнай аўтастаянкай, але галоўным чынам 1-га аўтатранспартнага кальца, якое пройдзе зноў жа побач з домам. І якраз ля гэтай парковачнай пляцоўкі намечана развязка — выезд з кальца на праспект Дзяржынскага... Карацей, як даводзіў намеснік галавы адміністрацыі Маскоўскага раёна **Уладзімір Танкевіч**, горад развіваецца і тут нічога не папішаш... Маўляў, шмат якім жыхарам горада прыходзіцца цярпець, бо па-іншаму нельга...

Жарсці на тым сходзе кіпелі — не перадаць, эмоцыі білі праз край. Упершыню давялося бачыць і чуць, як людзі прамым тэкстам абвінавачвалі мясцовую ўладу, якая не на іх баку, а на баку бізнес-заказчыкаў і іх падрадчыкаў. Але тыя прадставілі ўсе паперы, на якіх — ніякіх парушэнняў, усё, як кажуць, ціп-топ. Ну, на тое яны і чыноўнікі, каб паперы былі ў парадку... Па форме ўсё правільна як быццам, а па сутнасці? Па сутнасці жыхары дома №4 аказаліся ў каменным мяшку, бо з усіх бакоў — ніякай жывой прасторы. Ім і надалей прыйдзецца цярпець аўтамабільны смог, цеснату ў маленькім двары і засынаць пад лязгат чыгункі, якая зусім паблізу. Канечне, ініцыятыўная група бунтарскага дома не збіраецца здавацца, рыхтуе свае контраргументы і будзе судзіцца. Так і сказалі мне: шукаем добрага юрыста-адваката, які будзе прадстаўляць нашы інтарэсы ў судзе. А пакуль... Пакуль часовае зацішша перад бурай.

Пакідаючы Другі завулак Розы Люксембург і Мацвееўскі, не мог не кінуць погляд на сапраўдны цуд гэтага месца — на дуб-волат, які, дзякаваць Богу, пакінулі на нейкі час у спакоі. Кажуць, яго абнясуць тынам... Можа быць. Але гэта ніяк не супакойвае месцічаў. Ён быў абярогам і вартавым людзей, а не машын... А што цяпер?..

Памятаю, як у 2002 годзе падобная гісторыя пачалася паміж жыхарамі аднаго дома па вуліцы Веры Харужай і мясцовай адміністрацыяй. Тады нават работы па добраўпарадкаванні двароў былі прыпынены, чыноўнікі адступіліся ад першапачатковага плана. А чаму? Умяшаўся сам галава дзяржавы — Аляксандр Рыгоравіч... У мяне ёсць нават ксеракопія дакумента, на якім Лукашэнка ўказаў мэру Паўлаву: ***"За кожнае дрэва, бяздумна спілаванае, адкажаце галавой! Парадак тут адзін — захаваць прыроду!"***

А як у нашым выпадку? Хто адкажа галавой?

Георгій ЧЫГІР.
Фота аўтара.

Аляксандр Селязнёў прадстаўляў інтарэсы заказчыка ЗАТ "ЛЕКТ". Адбіваўся як мог...

МАЙ НА ЎВАЗЕ!

Валюта па пашпарце

З сённяшняга дня набыць валюту ў Беларусі можна толькі пры прад'яўленні пашпарта. Нацыянальны банк растлумачыў, у якіх выпадках і які дакумент трэба прад'яўляць.

Вашы даныя супрацоўнікі банкаў будуць патрабаваць пры

— набыцці наяўнай валюты,
— безнаяўнай валюты,
— плацёжных дакументаў у замежнай валюце (дарожных чэкаў).

Прад'яўляць трэба наступныя дакументы:

— пашпарт,
— від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь,
— пасведчанне ўцекача,
— пашпарт грамадзяніна замежнай дзяржавы.

Заносіцца ў камп'ютар будуць імя, прозвішча, найменне дакумента, яго серыя і нумар, ваш асабісты (ідэнтыфікацыйны) нумар, а пры яго адсутнасці — дата нараджэння.

ТЫМ ЧАСАМ

Зноў можна купляць за рублі залатыя зліткі

Таксама сёння Нацыянальны банк аднаўляе продаж праз свае структурныя падраздзяленні залатых, сярэбраных і плацінавых мерных зліткаў за беларускія рублі. Як вядома, з 15 красавіка такая аперацыя была забаронена, каштоўныя металы можна было набыць толькі за долары ЗША.

ЧУЛІ?

Мінскіх студэнтаў пазбавяць ільготнага праезду?

Адміністрацыя мінскага метро наракае, што з-за бясплатнага праезду студэнтаў і навучэнцаў штомесяц губляе 3,9—4 млрд рублёў. Пра гэта ў газетным інтэрв'ю паведаміў начальнік Мінскага метрапалітэна **Расціслаў Юрэня.**

Паводле яго слоў, штодня метрапалітэнам карыстаюцца 217 тысяч мінскіх студэнтаў.

Дарэчы, у некаторых сталічных ВНУ ўжо ходзяць чуткі, з 1 студзеня льготу на бясплатны праезд у студэнтаў забяруць, бо ў абласных цэнтрах студэнты за праезд па-ранейшаму плацяць.

У каждого 40-го жителя Беларуси выявлен рак

За последние 10 лет смертность от онкозаболеваний в нашей стране снизилась на 5 процентов, но количество онкобольных выросло за этот период на 20 процентов.

По словам руководителя Республиканского научно-практического центра онкологии и медицинской радиологии **Олега Суконко,** на диспансерном учете в связи с онкологическим заболеванием состоит каждый 40-й житель Беларуси — 242.298 человек.

За 10 лет число выявляемых за год случаев новообразований выросло с 33 тысяч до 42 тысяч. При этом число случаев рака предстательной железы выросло на 130%, рака кожи — на 79%, матки — на 42%, почки — на 38%, ободочной кишки — на 37%, молочной железы — на 31%. Прогнозируется, что через 20 лет онкологические заболевания будут ежегодно выявляться у 78 тыс. белорусов.

Как отметил специалист, почти 70% больных раком в Беларуси — пенсионеры.

ЛЮБОПЫТНО

Средний возраст белорусских мужчин — 37 лет

В прошлую субботу отмечался Всемирный день мужчин. По просьбе БЕЛТА Национальный статистический комитет нарисовал портрет среднестатистического белорусского мужчины.

На 1 января 2011 года численность мужчин в Беларуси составила 4 млн 408,2 тыс. человек, или 46,5% от общей численности населения. Три четверти мужчин — горожане.

Средний возраст мужчин на начало текущего года — 37 лет. При этом у мужчин, проживающих в городах и городских поселениях, средний возраст меньше, чем у мужчин, проживающих в сельской местности (соответственно 36 лет и 40 лет).

Средний возраст мужчин ниже среднего возраста женщин на 5,2 года. "Разница в среднем возрасте объясняется тем, что в республике сохраняется значительная разница в продолжительности жизни мужчин и женщин, составившая в 2010 году почти 12 лет (мужчины — 64,6 лет, женщины — 76,5 лет), — уточнила пресс-секретарь Нацстата Елена Кондратенко. — По оценке ПРООН, "естественной" разницей принято считать 5 лет. Подобный разрыв обусловлен преждевременной смертностью мужчин".

На 1000 мужчин в Беларуси приходится 1151 женщина. В городском населении численность мужчин превышает численность женщин преимущественно в возрасте до 28 лет, в сельской местности преобладание численности мужчин наблюдается в возрасте до 57 лет.

В прошлом году зарегистрировано 76 тыс. 978 браков. Большинство браков заключили женихи в возрасте 20—24 лет (33,4% от общего числа браков) и 25—29 лет (31,8%). Средний возраст жениха при вступлении в первый брак в 2010 году составил 26,5 года, при повторном вступлении в брак — 40,1 года.

По данным переписи населения 2009 года, почти каждый шестой мужчина имеет высшее образование. Женщин, имеющих высшее образование, больше, чем мужчин. На 1000 мужчин приходится 176 мужчин с высшим образованием, в то время как на 1000 женщин приходится 199 женщин, имеющих высшее образование.

Каждый третий мужчина (1437,9 тыс. человек) имеет среднее специальное или профессионально-техническое образование.

Для работающих мужчин приоритетными являются такие виды экономической деятельности, как промышленность; сельское хозяйство, охота и лесное хозяйство; торговля автомобилями и мотоциклами, их техническое обслуживание и ремонт; транспорт; рыболовство, рыбоводство; строительство, где их удельный вес — 55,7—82,2% от общей численности работников организаций соответствующего вида экономической деятельности.

В общей численности рабочих преобладают мужчины (56,5%), а в общей численности служащих выше удельный вес женщин (67,9%). Однако среди служащих большинство руководителей — мужчины (53,2%).

На протяжении ряда лет средняя заработная плата мужчин в организациях республики превышает заработную плату женщин. Так, например, в декабре 2010 года номинальная начисленная средняя заработная плата мужчин республики превысила заработную плату женщин на 13,1%.

СКАНДАЛ

Баі без правіл на лядовай арэне

Скандалам закончыўся ў мінулую нядзелю хакейны матч на «Мінск-Арэне» паміж сталічным «Дынама» і «Витязем» з Чэхава.

У выніку "Дынама" выйграла (3:2), але тое, што адбылося ў самым канцы гульні, яшчэ доўга будзе абмяркоўвацца балельшчыкамі. Справа ў тым, што падмаскоўныя хакеісты, калі ўжо бачылі, што матч прайграюць, пачалі адмыслова дубасіць беларускіх ігракоў. Проста так. Білі жорстка, супраціўлення беларусы практычна не аказвалі. У адказ не вытрымалі нервы ў некаторых беларускіх балельшчыкаў — на лёд паляцелі пластыкавыя бутэлькі, іншыя прылады.

Галоўны трэнер гасцей Андрэй Назараў таксама не саступаў сваім падначаленым. Схапіўшы клюшку, стараўся ўдарыць балельшчыкаў. Зламаў інвентар, схапіў другую... Усё гэта суправаджалася непрыстойнымі жэстамі рукамі, хоць побач былі жанчыны і дзеці. Пазней Назараў апраўдваўся, што ў яго патрапіла бутэлька, якую кінулі балельшчыкі, у хакеістаў тыкалі сцяжкамі, і ён раззлаваўся...

Зрэшты, да такіх паводзін "Витязя" ў КХЛ, напэўна, ужо прызвычаіліся. Гэта не першае лядовае пабоішча з удзелам падмаскоўнай каманды і, думаю, не апошняе. Туды спецыяльна набралі ігракоў, якія мала што паказваюць у спартыўным плане, але ім няма роўных у кулачных баях. Такіх хакеістаў называюць тафгаямі. Кажуць, што гаспадар клуба (расійскі бізнесмен Мікалай Паўлінаў) і сам аматар кулачных баёў, а таму за такія хакейныя мардабоі сваім ігракам яшчэ даплачвае.

Сумна, што кіраўніцтва Лігі фармальна падтрымлівае гэты "кулачны праект". 7 лістапада інцыдэнт у Мінску стаў прадметам разбіральніцтва на пасяджэнні спартыўна-дысцыплінарнага камітэта Кантынентальнай хакейнай лігі. У выніку тры ігракі "Витязя" атрымалі розныя дыскваліфікацыі са штрафамі, галоўны трэнер таксама прапусціць два матчы і заплаціць грашовы штраф. Адным словам, клуб, які справакаваў усю гэтую сітуацыю, лёгка "адскочыў". Сур'ёзна ў канфлікце, здаецца, ніхто разбірацца не стаў. Так што будзем чакаць ад "Витязя" новых прыгод на хакейных пляцоўках.

Дарэчы, Андрэй Назараў у хуткім часе прывязе ў Гомель на этап Еўравыкліку другую зборную Расіі. Відаць, чуе шкадлівы кот, хто з'еў каўбаску. *"У адзін з дзён я буду гатовы сустрэцца з беларускімі балельшчыкамі за кубачкам гарбаты і растлумачыць ім, дзе я паводзіў сябе няправільна і дзе, наадварот, эмоцыям паддаліся гледачы,* — распавёў трэнер расійскім журналістам. — *Спорт павінен нас аб'ядноўваць. Упэўнены, што такая сустрэча пойдзе ўсім на карысць".*

Напрыканцы хацелася б адзначыць, што мінскаму "Дынама" за паводзіны балельшчыкаў таксама ўстаноўлены штрафныя санкцыі — 500 тысяч расійскіх рублёў. Таксама КХЛ "выказала прэтэнзіі да работы службы бяспекі сталічнага клуба, у адносінах якой будзе вынесена асобнае прадстаўленне".

Алесь СІВЫ.

ОФИЦИАЛЬНО

За карту поляка — увольнение

Депутаты Палаты представителей в первом чтении приняли поправки к закону "О государственной службе Беларуси", которая запрещает государственным служащим Беларуси пользоваться картой поляка, а также аналогичными документами, предоставляемыми другими странами.

Как сообщила БелаПАН заместитель министра юстиции **Алла Бодак,** законопроект был подготовлен в целях выполнения рекомендаций Конституционного суда в его решении относительно закона Польши о карте поляка. Документ "направлен на устранение конфликта интересов при прохождении государственной службы".

Поправки устанавливают запрет на пользование госслужащими льготами и преимуществами, предоставляемыми иностранными государствами в связи с политическими, религиозными взглядами или национальной принадлежностью, а также на получение документов, предоставляющих такие льготы и преимущества.

Законопроектом закрепляется обязанность госслужащих передавать эти документы в кадровую службу госоргана. Несоблюдение этого требования будет являться основанием для освобождения госслужащего от занимаемой должности.

ДЗІКУНСТВА

П'яны расіянін забіў трох веласіпедыстаў

Жудаснае дарожна-транспартнае здарэнне адбылося ў мінулую нядзелю ля горада Хоцімска Магілёўскай вобласці.

35-гадовы грамадзянін Расіі, кіруючы ў стане алкагольнага ап'янення аўтамашынай "Рэно", здзейсніў наезд на трох мясцовых жыхароў — братоў. Як адзначылі ў ДАІ, яны ехалі на веласіпедах у адпаведнасці з правіламі дарожнага руху.

Усе трое загінулі.

Старэйшы з загінуўшых — 1986 года нараджэння, наймалодшы — 1994 года нараджэння.

У крыві кіроўцы было выяўлена 3 (!) праміле алкаголю. Гэта дзве бутэлькі гарэлкі! Дарэчы, у 2009 годзе расіяніна ўжо пазбаўлялі вадзіцельскага пасведчання ў Беларусі. Калі яго зараз прызнаюць вінаватым, яму "свеціць" пазбаўленне волі на 5 гадоў.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
9 ЛІСТАПАДА 2011 г.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Выбіраць мы можам так: ці балота, ці бальшак

Сацыялагічны цэнтр "Зеркало-Инфо" задаў пытанне беларусам: "Ці гатовыя вы ўдзельнічаць у мерапрыемствах, накіраваных на абарону вашых эканамічных інтарэсаў?" Толькі 12 працэнтаў апытаных сказалі, што гатовыя ўдзельнічаць нават у незаконных мерапрыемствах. Большасць жа выказалася прыкладна так: "Цяжка, але трэба пачакаць, усё адновіцца…"

Нейк на мяжы,
Што пралегла між сёл,
Стрэліся ў лесе бульбаш і хахол.
Колісь, было, сябравалі яны:
П'янкі сумесныя, дзеўкі адны.
Гэтулькі часу прайшло з той пары!
І абняліся былыя сябры.
Трохі хахол павагаўся спярша,
Потым распытваць пачаў бульбаша:
— Бачу, трымаешся ты на плыву...
— Дзякаваць Богу, паціху жыву...
— Кажуць, вас Бацька прыціснуў крыху.
— Я не палітык. Далей ад граху...
— Што, не чытаеш зусім ты газет?
Мне вунь дачка правяла інтэрнэт...
— Як жа, чатаю. Напрыклад, "СБ".
Слушнага многа бяру для сябе.
Апазіцыйныя ж плешчуць брыду.
І за нацдэмамі я не пайду.
— Ты мне прабач, ды спытаюся ў лоб:
Чым жа нацдэмы табе неўспадоб?
— Дык выступаюць жа Бацькі супроць.
Праўда, на іх ён накінуў аброць...
Захаду, бач, прадаліся за грош,
Хочуць, каб мы тут жылі як найгорш...
— Хто ж наплявузгаў такое табе?
— Наша БТ ды і тая ж "СБ".
— Глупства яны натаўклі табе ў плеш!
Справа твая... Раскажы, як жывеш.
— Так і жыву... Задаволены ўсім.
Толькі здароўя нямашка зусім.
Ныя спіна — хоць ты крычма крычы...
— Што, не памогуць і вашы ўрачы?
— Што ты! На лекі такая цана!
Не па кішэні мне, братка, яна.
Так і лячуся на зёлках-вадзе...
Жонка гарчычнік які прыкладзе...
— Кажуць жа, Бацька амаль што мільён
Кожнаму з вас выдае пенсіён.
Быў бы я рад, каб мне столькі далі...
— Прахам пайшлі тыя нашы рублі!
Што з тае пенсіі? Смех жа адзін:
Цэны растуць — хоць не йдзі ў магазін.
Свет жа не бачыў, каб гэтак было:
Мяса — сто тысяч амаль за кіло!
Так што наступіць, магчыма, хана...
— З голаду ж, бачу, яшчэ не сканаў...
— Неяк жыву з гаспадаркі свае,
Хоць на яе
Ужо сіл не стае.
Сена касіць — не хапае ўжо рук.
Здаў я карову. Застаўся парсюк.
Штосьці, бывае, сарву на градзе,
Нешта ад яблыні перападзе,
Часам і курыца яйка знясе...
Вось і харчы мае сціплыя ўсе.
— Ну дык чаго ж ты, браток, не крычыш?
Што ты сядзіш,
Як пад венікам мыш?
Слушную вельмі параду я дам:
Кінь гаспадарку, ідзі на майдан!
Там патрабуй, каб сышоў гэты ўрад.
Цвёрда трымайся! Ні кроку назад!
Прыклад з мяне, мой суседзе, бяры:
Я там стаю ад зары да зары...
— Хай мяне доля такая міне,
Супраць улады ісці — не па мне.
Конча калі ўжо не стане яды,
Смажыць і есці пачну жалуды,
Ці, як бабёр, буду грызці кару...
Так што ад голаду я не памру.
Не, не пайду я з уладай "на бой",
Гора само рассасецца сабой...
— Ёлупень ты і бязмозглы, як пень,
Так і жывеш, нібы той целяпень.
Дык і трывай, калі гэткі дурны...
Хопіць пра гэта... А як жа сыны?
Лёс іх які? Ашываюцца дзе?
Можа, як ты, "ля курэй, на градзе"?
— Ну, не зусім... Мой старэйшы — пусты,
Круціць быкам у калгасе хвасты.
Меншы — разумнік, ды шчыра скажу,
З'ехаў на працу адсюль за мяжу.
"Гэтая ўлада, — сказаў, — мне не ў масць".
Так што канацьму — вады не падасць...
— Братка, на меншага ты не грашы,
Жыць жа патрэбна — дзе лепей душы.
Збег жа ён, пэўна, адсюль нездарма,
Мусіць, для хлопца тут шчасця няма...
— Можа, і гэтак, а можа, не так...
— Гэтак! І вось што скажы мне, бядак:
Слухаю зараз я мову тваю
І, паляшуцкую, не пазнаю.
Што за "трасянка"? І нават амаль
Ты размаўляеш, як кляты маскаль.
— Гэтак цяпер балагурым мы ўсе,
Бацька ж уводзіць "язык" пакрысе...
Доўга яшчэ гаманілі сябры,
Покуль не стала цямнець у бары.
Сябру хахол паціскае руку,
Сцежкаю правіцца ён к бальшаку.
Цераз балота, напружыўшы зрок,
Ногі дахаты бульбаш павалок...

ІНШЫ ПОГЛЯД

Знайшла трагедыю!

Добрага здароўя ўсім!

Паважаная рэдакцыя, у №№165—166 ад 28 кастрычніка 2011 года на старонцы чытачоў быў надрукаваны ліст ад Алены Іванаўны з Мінска пад назвай "Хочу услышать совет". Нагадаю пра змест. Аўтарка піша, што ёй 76 год. Інвалід другой групы. Шмат хвароб мае. Жаліцца на сваякоў. Асабліва на нявестку, якая з ёй не хоча размаўляць па тэлефоне. Унукаў вінаваціць, што не чокнуліся з ёй келіхамі за сталом і гэтак далей. Знайшла трагедыю!.. Можа, большага гора не было ў жыцці?

Тое, што напружаныя адносіны склаліся з роднымі, адбылося нездарма. Прычына ў ёй самой. Таму і хварэе. Ганарлівасць не дазваляе ёй легчы ў ложак, каб спаць. Яна сядзіць на зэдліку ўсю ноч... Чаму? Дзякавала б Богу, што яе сына паважаюць іншыя. Толькі неразумны можа атручваць сябе крыўдай.

Валянціна ПАЖЫЛОВА.

г.Светлагорск.

АБЗАЦЕМ

Хватит уже плакать!

Многие кричат: бензин вот-вот снова подорожает... Но кто по 30—40—50 тысяч долларов на иномарку "накопил" честным трудом, тот и доллар на топливо наскребет.

Хватит уже плакать!

Татьяна Константиновна КАРЕЛИНА, ветеран труда, учитель.

Минск.

ОТ РЕДАКЦИИ

Уважаемая Татьяна Константиновна!

Но Вам, наверное, известны и слова литературного героя, который говорил, что автомобиль — это не роскошь, а средство передвижения. Посмотрите, сколько на наших улицах "металлолома", то есть машин далеко не новых, а возраст которых под 10, 15 и даже двадцать лет. Их владельцы — не олигархи, не чиновники-казнокрады, а простые люди, имеющие низкие доходы. Им что, из-за высоких цен на бензин ставить машины на прикол? А как добраться на отдаленную дачу, привезти оттуда выращенные овощи, фрукты? Да и мало куда еще нужно съездить?!

Нет, нельзя всех подводить под одну гребенку.

МЫСЛИ ВСЛУХ

Хочу жить, как в Финляндии

Финляндия вырвалась из большевистских лап, ее умные сыны построили если не рай, то хорошую жизнь для своего народа. Представим, что бы было, если бы в Финляндии были колхозы. Но людям дали собственность. Страна занимает первое место в мире по свободе слова. Если же я что-то говорю здесь, у себя в Беларуси, друзья одергивают: "Молчи, а то попадешь в психушку" или "Молчи, побойся за своих детей".

Финляндия дала приют нашему Василю Быкову, когда его здесь оплевывали.

Пенсии и зарплаты в Финляндии нельзя даже сравнивать с нашими. Я знаю здоровых мужчин, у которых зарплаты такие, что за полгода работы и приличный костюм себе не могут купить. Все уходит на питание, оплату коммунальных услуг. Старушки говорят: "Зато посмотри, сколько на улицах машин. Не так плохо живет народ". Я отвечаю: "Так что мы на собаках должны ездить?" Половину наших автомобилей пустили бы в Финляндии под пресс, там берегут атмосферу, природу.

Показывали как-то по TV премьер-министра Финляндии. Он работал на своем участке во время отпуска, как простой крестьянин, и без всякой охраны. У нас бы охрана под каждой елкой стояла и под каждой кочкой пряталась.

Вот если бы пригласить к нам на работу или финского премьера, или Маргарет Тэтчер: пусть бы они сделали жизнь белорусов достойной. А Лукашенко, помнится, сказал, что он нас за Европой не поведет. По моему мнению, во имя спасения Беларуси он должен уступить кресло другому. Легче всего распродать все, чтобы удержаться во власти. А кредитами он загоняет страну в кабалу, за эти кредиты будут платить не только наши дети, но и внуки и правнуки.

Тимофей МАКАРЕНКО. житель Витебска.

ПРОДОЛЖЕНИЕ ТЕМЫ

Исправлять придется долго

Автора статьи "Следственный комитет: "за" и "против" профессора Михаила Ивановича Пастухова знаю не один год. Знаком и с его концепцией судебно-правовой реформы и проектом закона "О следственном комитете РБ", который уже более 17 лет лежит мертвым грузом. Поэтому хочу продолжить тему, которую поднял М.И.Пастухов в своей статье о создании Следственного комитета.

Мне представляется, что выбрано не лучшее время для создания Следственного комитета и что цель затеянного и уже реализованного нынешней властью мероприятия — не улучшение работы, а несколько иная.

Во-первых, остановить "грызню" между силовыми ведомствами, изъяв из их подчинения такое "оружие", как следствие. Другими средствами сделать это не получилось.

Во-вторых, полностью подчинить следствие лично себе, как это уже произошло с судами. Взяв на себя функции назначения, перемещения и увольнения судей, президент тем самым заставил их работать по своему пониманию закона. Примеры судебных процессов после 19 декабря об этом ярко свидетельствуют. Сегодня даже не юристу уже очевидно, что у нас в республике нет "независимых судей, подчиняющихся только закону", а есть государственные служащие на должностях судей, назначаемые и смещаемые президентом. Это же произойдет со следователями.

Боюсь, что закон для этих людей будет вторичен. Первично будет выполнение "директивы сверху". Как это было уже не раз в истории. Например, законы Веймарской республики в Германии с успехом применял Гитлер. За что судей потом и повесили десятками. Или другой пример: совершенная Конституция СССР 1936 года не помешала Сталину залить кровью страну в 1937—1939 годах. Ведь все зависит от того, в чьи руки попадет это совершенное оружие — Закон.

Мы (Міша, 18-гадовы дзяцюк, Сярожа, панна Марыля і я) сабраліся ў гаспадаровым кабінеце і спехам прынялі агульнае рашэнне — адправіць блізнятаў з дому, каб яны не перапалохаліся, сутыкнуўшыся з праявай магчымага гвалту і грубіянства. А наша пакаёўка Вара прапанавала адвезці іх да яе бацькоў у вёску Лозкі. Гэта і блізка, і ўбаку ад Шчорсаў. Мы, вядома, з радасцю пагадзіліся. Там, здавалася нам, яны будуць у бяспецы. Пачаліся таропкія зборы. За намі следам ходзіць маўклівы, як заўсёды, калі хвалюецца, дзядзька Жуль, брат маёй мамы, які жыў разам з намі. То ён з дзецьмі, то пакуе клункі, то пра нешта заклапочана задумваецца. Трэба было, таксама не марудзячы, адправіць Паўла да яго сям'і. Ён асаднік, ваяваў з Саветамі, люты вораг бальшавікоў, і яму трэба схавацца. Міша ўзяўся збіраць зброю, што была дома, каб выкінуць у сажалкі. Нягледзячы на пратэсты панны Люцыны, трэба паадчыняць кладоўкі, шафы і спраты, каб пры непазбежным рабаўніцтве ашчадзіць абслугу ад здзекаў, але найважней, пакуль яшчэ не позна, адправіць Мішу і Малішэўскіх хлапчукоў у Наваградак да Марылькі і Каці.

Пад тэрасу падвялі асядланых коней. Развітанне з Мішам было імклівае і хвалюючае. Поль жагнае яго і абдымае... "Не забівай нікога!" — далятаюць да мяне яго словы.

Са сціснутымі пашчэнкамі і каменнымі абліччамі хлопчыкі садзяцца вярхом. Моўчкі іх праводзіць пані Малішэўская і ўся чэлядзь. Мы таксама акамянела глядзім, як яны знікаюць з вачэй, але задумвацца над усім няма калі. Пакуль апранаюць блізнятаў, мы з Полем і Сяргеем ідзём у кабінет. За пісьмовым сталом Поль з заклапочаным тварам разбірае паперы і дакументы. Сярожу нездаровіцца, але дапамагае мне ўкладваць іх у куфэрак разам з нешматлікімі залатымі рэчамі і грашыма, каб усё гэта перадаць на захаванне панне Марылі. Чуем, што каляска з Васілём, нашым кучарам, ужо пад'ехала да тэрасы. Збягаем уніз... Нясуць брэзент, апаясаны дзягамі, — з пасцелямі, кладуць яго пад ногі Васілю. Сярожа і Каця ў ясёнках, няўцямна, але моўчкі глядзяць на гэтыя зборы. Сядае панна Марыля, побач з ёю Кацька; Сярожку падаюць панне Марылі на калені. Ля іх ног нейкія клункі, валізкі прывязаны ззаду. Сціскаецца сэрца ад бесклапотных, даверлівых абліччаў дзяцей. "Гатова! З Богам!" — кажа хтосьці ззаду. Рушылі! Я падбягаю, крычу ім услед:

— Мы хутка прыедзем дапамагчы вам уладкавацца.

Дзеці махаюць хусцінкамі... паехалі. Дзядзька Жуль, правёўшы дзяцей, пайшоў у свой пакой. Сярожа таксама лёг у сваім. Усе разбрыліся, і раптам стала ціха і пустынна...

Штосьці парвалася і знікла назаўсёды. Чэлядзь таксама кудысьці пахавалася.

— Пойдзем у парк, — сказаў Поль.

Ён выглядаў такім знямоглым і стомленым, што ў мяне перацінала дыханне. Усю раніцу я намаўляла яго паехаць з Мішам у Наваградак — яму як абшарніку пагражаў арышт, але ён наадрэз адмовіўся пакінуць Сярожку, блізнятак, мяне і ўсю абслугу.

Дарогі ўжо небяспечныя, думала я, атрады салдатаў могуць спыніць, арыштаваць, а то і прыстрэліць пры супраціўленні. Цяпер ужо позна штосьці прыдумаць. Гэта, нібы ўпушчанае і недароблене, мяне смутна гняло. А ўсё ж пры гэтым і ўнутраная радасць: што ён тут, і я не самотная.

Майму мужу Полю да гэтага часу ўжо мінула 60 гадоў, мне 45, але мы абое былі маладжавымі, жыццярадаснымі і здаровымі. Абое ўмелі радавацца і асабістаму жыццю, і працы ў маёнтку, і сям'і. Мы былі жанатымі ўсяго 6 гадоў, пабраліся пасля смерці яго першай жонкі, якую я даўно ведала і любіла, як і ўсю іх шматлікую і цудоўную ва ўсіх дачыненнях сям'ю. Віхура падзей захапіла нас знянацку, як і ўсіх у Польшчы. Мы наіўна давяралі падпісаным пагадненням аб ненападзе і бяссрэчнай дапамозе Англіі і Францыі...

Выйшлі з дому, такога расхлабучанага ў гэтай ліхаманкавай валтузні. А ў парку так незвычайна ціха! Свеціць сонейка як звыкла, нібыта нічога не здарылася, плаваюць лебедзі. Восеньскія кветкі на клумбах яшчэ не адкрасавалі і не змятыя. Сям-там пад нагамі ўжо шархаціць шапаткое асенняе лісце. Такі зацішак, ілюзорны спакой. І гэтая, быццам у сне ці ў казцы, неадпаведнасць з сапраўднасцю ўсё ж спрыяе адхланню і ўнутрана супакойвае. Жыццё, насуперак усяму, правіць сваё і працягвецца!

Апошнія імгненні свабоды і шчасця, так яскрава тады адчутыя. Што можна пра іх сказаць? Мы ішлі паўз сажалкі, глядзелі на палац. Людзей не бачна, і адміністрацыя быццам вымерла, ні шуму, ні ветру. Усё заціхла.

Занадта перапоўненыя трывогай і хваляваннем, каб пра гэта гаварыць, ішлі моўчкі, і ў гэтым супольным маўчанні — такая ўнутраная лучнасць і повязь.

Але вось ужо далятае і спакваля ўзмацняецца нейкі пабочны, чужы нам гук — ці то пошчак конскіх капытоў, ці то гул самаходу, ці ляскат жалеза на падводах. Мы марудна вяртаемся дахаты.

Хворы, худы, з бліскучымі ад ліхаманкі вачыма, усхваляваны Сярожа ідзе нам насустрач. Мацней і мацней адчуваецца задушлівая пятля... Пакуль Поль сядзеў з Сярожам, я пазбірала параскіданыя рэчы. Няхай усё будзе ў парадку — ніхто не ўцякаў; дом абжыты і спакойны!

Разгубленая, дрыжачая нянька дапамагае мне падбіраць з падлогі тэрасы нейкія дзіцячыя транты. Цёпла, як летам. Усё заліта сонцам. Не ведаючы, што нас чакае, мы, не зважаючы на пратэсты Сярожы, усё ж угаманілі яго і дзядзьку Жуля пайсці да блізнят у Лозкі. Правёўшы іх тыльным ходам праз кухню, мы вярнуліся на тэрасу і селі за стол.

Сядзелі моўчкі, кожны згадваў і думаў пра сваё. Тут, на тэрасе, мы летам заўсёды палуднавалі вялікай, гаманлівай сям'ёй... Нязмерна тоўстыя, круглявыя калоны падтрымліваюць балкон кабінета, перад намі вазоны і ружы, якія сам Поль даглядаў... Колісь наш цяперашні дом, паблізу развалін палаца і толькі што адрамантаванага флігеля, быў домам упраўляючага, а тэраса — зашклёнай, высокай аранжарэяй... Шмат сюды за прамінулыя гады было ўкладзена працы... І, здавалася, кожная самая нязначная рэч знайшла сваё звыклае месца ў гэтай цудоўнай старой сядзібе...

Шум і гам спакваля нарасталі. Мы чакалі, што парк з хвіліны на хвіліну запалоняць людзі, але калі гэта здарылася — усё нахлынула нечакана і жахліва.

Яны ішлі гуртамі і паасобку, азіраючыся, быццам чакаючы нападу. Памалу збіраліся вакол дома і перад тэрасай. Спераду абліччы ўсе незнаёмыя, а ззаду — і нашы шчарсоўскія мужчыны і бабы. Чэлядзі няма — усе пахаваліся.

Поль і я моўчкі ўсталі ім насустрач. Было б ціха і нават прыстойна, каб наперадзе не ішоў п'яны, расшпілены насцеж ці то парабак, ці раменнік. Ён ішоў хістаючыся і выкрыкваў трафарэтныя рэвалюцыйныя лозунгі. У руках трымаў нашу паляўнічую стрэльбу, узятую, верагодна, у адміністрацыі, і пагрозліва настаўляў рулю на Поля. Я ведала, што яна не заладована, што ніводнага набою, ніводнай кулі ў маёнтку няма, але ўсё ж апанавала спаняверка, я ўнутрана перапалохалася, мне заняло дух! Натоўп на яго крыкі мала зважаў. Але, убачыўшы ў ягоных руках стрэльбу з накіраванай у наш бок руляй, сяляне падбеглі, з лаянкай абяззброілі яго і выштурхнулі вонкі. Яны яшчэ доўга працягвалі крычаць міжсобку, штосьці абмяркоўваючы, не звяртаючы на нас увагі...

Увайшоўшы ў дом, мы праз другія дзверы, мінуўшы натоўп, зноў выйшлі ў парк. Здалёку ўсё гучней і гучней чуўся нязвыклы шум — Чырвонае войска займала мястэчка Шчорсы. Зрэдку гучалі асобныя стрэлы, а над намі нізка кружыў самалёт.

Мы памалу рухаліся ў напружаным маўчанні па знаёмай дарожцы. Пачуццё якогасьці здранцвення і нерэальнасці апанавала нас абодвух, але ні страху, ні смутку я не адчувала, а так, нейкае спусташэнне...

Зусім не памятаю, як сплываў час. Ішлі, сядалі на лавачку, зноў крочылі па апусцелых алеях, прастарэкуючы пра штосьці нязначнае, нібыта знаходзіліся звонку рэальнасці, пакуль не адшукала нас пакаёўка Ядзя.

— Граф, я правяду вас у Лозкі, задворкамі, — сказала яна па-польску. — Бо хто іх ведае, што будзе!

Яна прынесла Полю світку, а мне ясёнку, дапамагла нам апрануцца і павяла палямі, агародамі і задворкамі сялянскіх хат. Мужыкоў нідзе не было бачна — адныя бабы і дзеці, ды і то больш сядзелі ў хатах, чакаючы — што будзе.

— Шмат хто сустракаў войска з хлебам-соллю, — таропка распавядала Ядзя нам па дарозе. — Кажуць, што Саветы прыйшлі вызваліць нас ад нямецкай акупацыі і ад уціску палякаў. Войскі ўжо занялі ўсё мястэчка; пляц перад царквой запруджаны жаўнерамі, вазамі, коньмі, самаходы рулююць па дарогах! — І памаўчаўшы дадала. — Мяркую, вас пойдуць рабаваць! У доме ж усё паадчыняна, і кладоўкі, і шафы, а ўсё ж поўніцца запасамі.

— Ядзя, скажы абслузе, хай возьмуць, што каму патрэбна, і запасуцца харчамі, а то, баюся, будзе позна.

Мы не спяшаючыся ішлі па апусцелых палях, сонца стаяла яшчэ высока, гул і шум натоўпу засталіся дзесьці ззаду. Моўчкі падышлі да невялікай і незаможнай вёскі Лозкі.

Бацькі Вары жылі ў непагляднай хаціне ў самым канцы вёскі. Два акны на вуліцу, ганак са двара, вузенькія сенцы. Зайшлі — закапцелыя сцены, нізкая столь, лавы паўз сцен, велізарная печ займае трэць пакоя, у куце стол з аб'едкамі, над ім вісяць цёмныя абразы. Нас сустрэлі, нізка кланяючыся, пажылыя гаспадары. Прыціхлыя дзеці перамаўляюцца шэптам, зрэдку хіхікаючы. Сярожа, у кажушку, хоць тут зусім цёпла, зрэдку на іх сыкае. Трагічная, рашучая панна Марыля завіхаецца ля стала, прыбіраючы посуд.

— А Юлій Станіслававіч толькі што выйшаў, хацеў ісці да вас, — сказала яна. — Вось, выпіце гарбаты і перакусіце, напэўна, нічога з раніцы не елі!

Мы селі за стол. У гэтай занядбанай хаціне навісла над намі нейкая пагрозлівая цяжкасць. Гаспадары напалоханыя за сябе і за нас. Яны не адважыліся адмовіць, калі іх дачка Вара раніцою папярэдзіла наконт прыезду дзяцей да іх у хату на няпэўны час. Заўважнай была жалю вартая разгубленасць, спалучаная з выразнай шкадобай да нас. Тут жа і страх за сябе, а ў нас такая няёмкасць і спасцярога іх падвесці.

Ядзя, развітаўшыся, пайшла. Гаспадары выйшлі ў другі пакой, пакінуўшы нас адных. Прынеслі гарбату, нейкія канапкі, мы сядзелі і чакалі, акружаныя дзецьмі. Так супакойвалі іх шалапутныя размовы, шчасце бачыць іх поўны давер у гэтай незвычайнай сітуацыі і такая адсутнасць страху і турботы. Мы ж вырашылі, прыцемкам, прысыпіўшы іх, разам з Сярожам вярнуцца ў Шчорсы.

Чакалі нядоўга. За акном пачуліся крыкі, потым таропкія крокі, і на ганак ступілі некалькі вайскоўцаў. Мы выйшлі ім насустрач. У сенях яны абшукалі нас, і старэйшы салдат заявіў:

— Не бойцеся, мы толькі завядзём маладога хлопца зарэгістравацца, а вы тут пачакайце, — яны спынілі нас, бачачы, што мы хочам ісці разам.

Сярожу павялі, мы ледзь паспелі з ім на хаду развітацца. Правёўшы яго, я на ўсялякі выпадак перадала панне Марылі ўсе грошы, якія ў мяне былі ў незнарок прыхопленай сумцы. Быў тут і браслет, падораны мне сястрой Поля, — вясельны падарунак. Пакінула толькі маленькую іконку Божай Маці, якая потым шмат гадоў суправаджала мяне ўсюды... Валізку з дакументамі і грашыма панна Марыля ўжо паспела кудысьці схаваць.

Сонца схілялася да захаду. Было каля пяці гадзін спалудня. Так ярка і прыгожа асвятляліся вокны, заліваючы ўсё чырванаватым святлом, калі, голасна крычучы, прыйшлі па нас чалавек дзесяць у цывільным, падобных на фабрычных работнікаў. Некаторыя з іх былі апрануты ў брудныя рабочыя спяцоўкі, іншыя — у скуранкі і боты з высокімі халявамі. Мы заспяшаліся да іх на двор, баючыся, каб яны не напалохалі дзяцей.

— Збірайцеся ў гміну. Там разбяруцца, — крычалі яны нам.

Зайшлі ў хату, спехам пацалавалі дзяцей.

— За іх не бойцеся! — паспела панна Марыля шапнуць па-польску, праводзячы нас на двор. Азірнуліся. Дзеці прыліплі да шыбаў. Доўга мне потым мярэжыліся іх расплюснутыя тварыкі і пільна наструненыя ў наш бок вачаняты... Гаспадароў не відаць, мабыць, пайшлі да суседзяў.

Вялі нас шырокай вясковай вуліцай. Абапал хаты, сям-там жанчыны з дзецьмі на руках моўчкі праводзілі нас спалоханымі вачыма. Старэйшыя хлапчукі забягаюць то спераду, то ззаду, узбуджаныя незвычайным відовішчам. Пасярод вёскі нас спынілі і акружылі, каб абшукаць. Зброі ў нас, вядома, не было, але, вывернуўшы ўсе кішэні, выцягнулі ў Поля гаманец.

— Пасматрыця, пасматрыця! Я за ўсю сваю жызню яшчо ня відываў столька-та дзеньгаў! — урачыста залямантаваў адзін, патрасаючы перад натоўпам пачкам крэдытак.

У мяне адабралі гадзіннік, у Поля таксама, але, пашарыўшы ў сумцы, пакінулі хусцінку і іконку. Зноў сціснулася кола вакол нас. Рабочы з гаманцом усё яшчэ высока трымаў крэдыткі, паказваючы іх сялянам, а мы працягвалі крочыць па прамой, пыльнай дарозе ў Шчорсы.

Вось ужо злева бачны парк, дом, развалiны палаца, карэ адміністрацыі, а справа ад дарогі толькі што збудаваная амбулаторыя, ужо абсталяваная ўсімі патрэбнымі інструментамі, якія мы яшчэ так нядаўна разам з Полем куплялі ў Вільні...

Тут стаіць натоўп. Дзверы і вокны расчынены насцеж. Верагодна, усё разрабавалі, думаю я. Ідзём далей не спыняючыся. Злева ад дарогі, збоку аднапавярховы будынак з высокім ганкам, вокнамі з выглядам на двор, адасоблены ад вуліцы высокім парканам. Востраверхая страха. Гэта гміна, вясковая ўправа Шчорсаў. Увесь двор і прылеглая вуліца запруджаны народам. Тут усё перамяшалася — мужыкі, бабы, салдаты, рабочыя. Сярод іх шмат незнаёмых сялян, верагодна, з суседніх вёсак. Гурт нашых мужыкоў нерашуча перамаўляўся, яны трымаліся разам, пры нашым набліжэнні галасы іх рабіліся ўсё гучней і гучней. Мы ўжо выразна чулі іх пратэсты і асобныя воклічы.

— Чаго гэта вы так? Куды іх ведзяцё? Чым яны не дагадзілі? Гэта добрыя людзі!..

Наш канваір без цырымоніі праціснуўся праз натоўп і, расчыніўшы насцеж дзверы, увапхнуў нас у прыхожую. Я тут ніколі не была, але, напэўна, раней уздоўж сцен стаялі лавы для наведвальнікаў. Цяпер было пуста, ад лаў засталіся толькі шнары на сценах, падлога затаптана, ля дзвярэй — вайсковец з вінтоўкай. Ён пхнуў нагой; завішчэлі завесы аднастворкавых, афарбаваных на карычневае дзвярэй. Салдат, прытрымліваючы іх рукой, прапусціў нас у вялікі квадратны пакой. Нервы былі напружаны, і я міжволі заўважала кожную дробязь, кожны гук. Мы ўвайшлі і спыніліся. Праз шызы дым ад цыгарак у першыя хвіліны мы нічога не бачылі. Пастаялі, агледзеліся. Два акны на вуліцу, насупраць дзверы, другія з тыльнага боку, пасярэдзіне доўгі стол, уздоўж сцен лаўкі, сям-там крэслы. Над сталом вісячая электрычная лямпа, нізкая столь. Увесь пакой поўны людзей: мужчыны, кабеты ў кажушках і гарадскіх ясёнках, іншыя проста ў летніках і сукенках, у хустках. Гэта ўсе — арыштаваныя ў першую чаргу, як потым даведаліся, па складзеным загадзя спісе, шмат і выпадкова захопленых на дарогах уцекачоў са сваіх наседжаных куткоў ад нечаканага нашэсця бальшавікоў. Тут і ўжэнднікі, паштары, паліцыянты, багацейшыя мужыкі і ўсе, хто не паспеў ці не схацеў, як і мы, уцякаць са свайго дома.

Руіны палаца Храптовічаў. Здымак 1940-х гг.

Насустрач нам падняўся Сярожа, такі худы і збялелы, з нейкім не па ўзросце рашучым поглядам. Усё адно было радасна адчуваць яго побач. Мы селі разам у вольным куце, на падваконні, Полю хтосьці прынёс крэсла. Ён стомлены, тужлівым уважлівым поглядам няўцямна глядзіць у акно.

Мы ціха перамаўляемся з Сяргеем, шукаем сярод арыштаваных знаёмых. Ён нам паведамляе, як яго ўпісалі ў нейкія спісы і потым прывялі ў гэты пакой. Усё ж мы спадзяёмся, што, праверыўшы, нас усіх адпусцяць дахаты... А дзверы вішчаць і вішчаць, і пакой напаўняецца ўсё больш і больш. Глядзім у акно: на такім знаёмым нам пляцы салдаты атабарыліся бівуаком. Сям-там гараць вогнішчы. Брычкі, калёсы. Распрэжаныя коні, худыя як цені, паныла стаяць на дрыжачых нагах. Вакол мужыкі дзівяцца на гэтую худобу, на выпнутыя рэбры, на ўздутыя жываты. Магчыма, гэта было ім першае папярэджанне ўвачавідкі пра будучыя голад і нішчымніцу. А нам усё вакол здавалася не рэальным — і гэтыя невядома чаго счакалыя людзі, напалоханыя і зацкаваныя, і мы ўтрох, і гэты чужацкі гам на дварэ, і трывожнае шапаценне ў кутках...

Як пачало вечарэць, запалілі цьмяную лямпу, за акном ярчэй палыхнулі агні, а сярод нас, у цеснаце і дыме, сілуэты людзей набылі фантастычны выгляд якіхсьці начных зданяў.

Калі зусім сцямнела і большую частку людзей кудысьці адвялі, нас разлучылі. Поля і некалькіх мужчын уцісналі разам, насуперак маім просьбам адпусціць Сярожу як недарослага і нездароўчага. Як потым выяснілася, іх заштурхалі ў маленечкую камеру, дзверы з якой выходзілі ў перадпакой. А нас, кабет, чалавек восем, — у суседні пакой. Там быў суцэльны вэрхал. Я ж разлучылася з Полем і Сярожам, нават не паспела сказаць ім чагосьці самага істотнага, і толькі вачыма правяла да дзвярэй, куды іх павялі. Пайшлі! Ці надоўга? —круцілася ў маёй галаве. Госпадзі! Можа, і лепш для іх абодвух, што яны разам! Так думала я. Не верылася, што гэта можа задоўжыцца. Усё здавалася не сапраўдным, быццам знарок наладжанае, і сумна і блытана снаваліся думкі ў галаве падчас гэтай першай самотнай і бяссоннай начы...

Пакой, куды нас завялі, замкнуўшы за намі дзверы на ключ, аказаўся досыць вялікім. Адно акно выходзіла на двор перад гмінай і бальшаком. Другое — на маленькі дворык з прыбіральняй зводдаля — драўлянай будкай, звычайнай у вёсках. Ілад акном па двары хадзіў вартавы са стрэльбай. Мы запалілі вісячую электрычную лямпу, завесілі акно хусткай... Азірнуліся...

Уздоўж сцен нары на два паверхі. Перад акном стол і два стулы.

З дому прынеслі і перадалі нам сёе-тое з ежы. За нашымі дзвярыма чуваць крокі і чыясьці гаворка. Ноч светлая, месячная. Хто тут? Абліччы чужыя, падазроныя, погляды недаверлівыя, з нашых шчорсаўскіх нікога. Яны ўсе размаўляюць міжсобку шэптам па-польску. Я ўладкавалася зверху, у кутку, бліжэй да акна — усё ж можна, адсланіўшы фіранку, пазіраць на прыціхлы пляц, цяпер заліты месяцовым святлом, глядзець на яснае неба, усыпанае зоркамі... З нас, вядома, ніхто не распранаўся, усе мы чакаем чагосьці, і невядомасць гэтага чакання трымала нас усіх насцярожана, не даючы нікому заснуць.

Пад раніцу стала холадна, балелі косці ад нязвыклага ляжання на голых дошках. Так, у нейкім дзіўным здранцвенні, праходзілі першыя дні нашага зняволення. Усе мы былі разгубленымі ад раптоўнага здарэння і не ведалі, чаго нам чакаць і на што спадзявацца. На шчасце, сталі часам пускаць дзядзьку Жуля, які паважна і смела размаўляў з вартавымі. У выключных выпадках паказваў свой французскі пашпарт, выклікаючы гэтым здзіўленне ў ахоўнікаў. Пакруціўшы ў руках незнаёмы дакумент, яны перапытвалі адзін аднаго: "Што з гэтым грамадзянінам рабіць?" Наведвалася і Ядзя — яна таксама нікога не баялася, прынесла коўдры, падушкі, рэгулярна насіла ежу. Шэптам распавядала апошнія навіны, часткова па-польску, часткова па-беларуску.

Дом абрабавалі, найперш шмат пажывіліся і нашы шчорсаўскія, цягнулі ў клунках бялізну і вопратку, а што з клункаў павыпадала, дык і цяпер валяецца па ўсяму парку. Калі прыйшло Чырвонае войска — байцы кажуць: "Нашае даброе!" Нікога і блізка да сядзібы не падпускаюць, а самі самаходамі вывозілі, кажуць, проста ў Мінск. Вось толькі зацяжкія для іх раялі Юлій Эдуардавіч збярог. Пра нашых і графа, калі пытаем, адказваюць: "Яшчэ жывыя!" А ў парку каля ста чалавек расстралялі, пераважна начамі, за рабункі, а магчыма, і яшчэ за нешта, мы не ведаем.

— Як блізняты? Панна Марыля? — пытаюся са страхам.

— Дзеці здаровыя, пачуваюцца ніштавата, жывуць у Вары ў хаце, панна Марыля іх даглядае, нікога не баіцца, ды яе і не чапаюць!

— Што чуваць пра графа з Сяргеем? — з замлелым сэрцам чакаю адказу.

— Мы ж занеслі ім коўдры, носім ежу, нас туды не ўпушчаюць, аддаём вартаўніку, — дадала яна, са спачуваннем паглядзеўшы на мяне.

Аднойчы прынёс дзядзька Жуль пляшку каньяку, з сургучовым штэмпелем і з прывешаным аптэчным ярлыком на імя Поля. Надпіс лекаў лацінскі. Аддаў ахоўніку, строга загадаўшы:

— Перадайце графу, гэта яго лякарства, пры ім і адкаркуеце!

Паглядзелі, перадалі... Я радавалася, уяўляючы здзіўленасць, а галоўнае суцешную думку, што пра іх памятаюць, на іх не забыліся!

(Працяг на 6-й стар.)

Злом

Так выглядалі ў міжваенны перыяд звычайныя графскія сяляне. На здымку — сям'я Грышкі Варанца (афіцыйнае прозвішча Лецка) з вёскі Пабрэззе. Сядзяць: Рыгор Іванавіч з жонкай Надзеяй Сільвестраўнай; стаяць: дачка Клаўдзя, пляменнік Жэня і брат Павел.

(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.)

Пра нас нашы новыя ўлады першы тыдзень нібы зусім не памяталі. Раніцай і вечарам вадзілі пад канвоем умывацца, выпускалі ў маленькі калідор, дзе была ракавіна і халодная вада; запускалі па двое, вартаўнік заставаўся вонкі ля зачыненых дзвярэй. Тут можна было і штосьці з бялізны памыць, і пачысціць зубы. Вадзілі ў прыбіральню на двор. Па чарзе мы прыбіралі сваю камеру, калідоры і канцылярыю, дзе часта сядзелі вайскоўцы, гулялі ў карты, палуднавалі за доўгім сталом. Падмяталі затаптаную падлогу бярозавым венікам, папярэдне папырскаўшы яе з жалезнага імбрычка вадою.

Аднойчы, у пахмурны восеньскі дзень, выводзяць нас на двор. Ля дзвярэй прыбіральні з вінтоўкай у руках стаіць наша птушніца — прысадзістая, чырванатварая, курносая Соня. Нязграбна ашчаперыла вінтоўку аберуч. Убачыўшы мяне, адвярнулася, утаропіла вочы долу.

Дні ідуць... Мы сочым, як выводзяць у тую самаю прыбіральню мужчын. Бачым іх спіны і знямоглую, марудную хаду. Перад прыбіральняй стаяць у чарзе. Яны не ведаюць, куды нас загналі, і не глядзяць у нашае акно. А мы бачым іх паніклыя вочы, няголеныя, шэрыя твары, але асцерагаемся пастукаць у шыбу. Стараюся пры любой нагодзе выпытаць у салдат хоць штосьці пра Поля і Сярожу. Ёсць і сярод ахоўнікаў спачувальныя людзі, гэта бачна па іх вачах, па выпадковай дапамозе, па нясмелай усмешцы...

— Вось вам кашулі, — прынёс мне адзін з такіх і, не глянуўшы, сунуў пакунак бруднай бялізны. — Звашывелі, памыйце.

На шчасце, ёсць у мяне ў запасе чыстая змена. Ахоўнік узяў, дзелавіта ўсёператрос — ці няма запіскі, і абяцаў перадаць.

У калідоры, без чаргі, я мыю пад кранам у маленькай ракавіне. Ёсць мыла — прынеслі з дому, але вада ледзяная, і яно не мыліцца. І ўсё ж адчувалася ў гэтых кашулях штосьці свойскае, бясконца блізкае і дарагое; і дасюль успамін пра тое "пранне" застаўся радасным і светлым на тле таго спрэс змрочнага часу. Яны тут, за сцяною, побач, і гэтая блізкасць і радасная, і пакутная. Хоць нічым, нават словам, ім нельга дапамагчы.

Дні цягнуцца аднастайна і марудна, але вось у адзін з такіх нудотных і цягучых дзён, калі апрыкрылі і сцены, і вокны, і выгляд на апусцелы пляц, у ціхую гадзіну адчыніліся дзверы і ўвайшоў жаўнер, — малады, у добра падагнаным шынялі і чыста паголены. Я звыкла сяджу на нарах, падкурчыўшы ногі, накрытыя пледам. Жаўнер дзвярэй за сабою не зачыняў, наадварот, адчыніў іх насцеж. Мы ўсе спалохана насцярожыліся.

— Вось, мы пакажам нашым байцам, за што яны змагаюцца. Няхай паглядзяць на ворагаў народа, прыгнятальнікаў нашых беларусаў. Вось і графіня з палаца тут сядзіць. Палюбуйцеся!

Радком, па чарзе ўваходзяць салдаты, спыняюцца, пазіраюць, абглядваюць, праходзяць далей. Што яны думаюць? Часцей маўчаць, зрэдку пасмехваюцца, часам скажуць грубае слова, але найбольш гядзяць не міргаючы, паважна — магчыма, няўцямна. Аблічча найчасцей маладыя, чыстыя, часам зусім дзіцячыя. Глядзяць, праходзяць... Спачатку гэта было страшна — ці не расправа? Потым усё прытупілася, і я ўжо не адчувала ні ганьбы, ні страху, ні гневу. Так, нейкае абыякавае акамяненне...

Прайшла гадзіна, а мо і болей. Нашы жанчыны сядзелі нерухома і моўчкі. Толькі адна, маладая, зрэдку ўсхліпвала і крадком выцірала вочы. Нарэшце зайшоў салдат больш сталага веку, з сівізной у валасах. Прыпыніўся, азірнуў нас усіх, раскрыжаваў рукі папярок расчыненых дзвярэй і, павярнуўшыся да хваста чаргі, крыкнуў:

— Сорам — жанчыны як жанчыны. Пайшлі прэч!

Выйшаў сам і зачыніў за сабою дзверы. Пачулася лаянка, але спакваля сціхла, і тупат ног пачаў аддаляцца. Стары жаўнер пільнаваў дзверы да ўсталявання поўнай цішыні. Былі яшчэ чуваць перамовы з нашым вартаўніком, потым усё заціхла. Так закончыліся тыя "агледзіны". Пайшлі... Мы пераглянуліся між сабою і ўся гэтая сцэна нам усім здалася раптам такой бясконца тупой і дурной, а недасканаласць і нежыццёвасць іх прапаганды такой камічнай, што ўпершыню за гэты час мы не здолелі стрымаць дружнага смеху. Вядома, гэта не быў бесклапотны і вясёлы смех — у ім чуліся і горыч, і палёгка пасля пераражытага напружання, і радасць, што гэта ззаду... Гэтае хваляванне, якое мы так усе супольна адчулі, нас па-сяброўску неяк аб'яднала, і тут упершыню я была прынята ў іх польскую сям'ю.

Прайшло яшчэ некалькі дзён у нейкім зацішшы. Заходзілі да нас радзей. Перадачы прыносілі штодня, але перадавалі праз ахову. Пачалі нашых мужчынаў выводзіць на шпацыр па паўгадзіны на двор. Нас таксама, але ў іншы час. Вязні праходзілі міма нашага акна і шукалі нас вачыма, мабыць, цяпер ужо ведалі, дзе мы. Мы гуртам стаім ля акна. Пазіраем, як яны цугам, адзін за адным, кружляюць па пратуптанай сцяжыне. Потым зноўку праходзяць міма нашага акна, але спыніцца не могуць, іх спехам адганяюць да дзвярэй у іхнюю камеру.

Аднойчы клічуць мяне мае супольніцы да акна. Ля акна — Поль! Аброслы, худы, з ліхаманкава бліскучымі вачыма. Канвой далёка, стаіць ля паркана, размаўляе, пакурвае. Я расчыніла акно. Канвой адвярнуўся! Што гэта? Штосьці здарылася? — мільганула ў мяне ў галаве. Былі апошнім часам розныя чуткі — наконт суда, пра расправу, пра новыя строгасці, пра нейкіх, што прыехалі з Мінска, камісарах, але я ўсёй сваёй існасцю не верыла, што будзе дрэнна. Поль, зняможаны, з павялічанымі вачыма, пільным поглядам узіраецца ў мяне, і раптам...

— Волечка, табе застанецца Сярожа! — і працягнуў мне рукі.

— Што? Што ты хочаш сказаць?

Ды канвой ужо наблізіўся, падхапіў Поля пад пахі і павёў...

Акно зачынілі звонку і забілі дошкамі. Тут я, здаецца, упершыню не звалодала з сабой. Мяне нібы трасца трэсла, зубы стукаліся аб шклянку з вадою, якую мне бесперастанку давалі мае ласкавыя супольніцы. Мяне апанаваў жудасны, жывёльны страх перад чымсьці непазбежным, нялюдскім і агідным. Цямнела, запалілі святло. Нейкая ўнутраная рашучасць выспявала ў маёй душы. Прыкінуўшыся хворай, я папрасілася выйсці. Пусцілі. Дайшла да прыбіральні сама. Стаіць Соня са стрэльбай, адвярнулася, на мяне не глядзіць.

— Соня, кажы, што, графа расстраляць збіраюцца?

Шэпт:

— Ня ведаю.

Маўчанне, потым:

— Сёння рашаць на сходзе, каго куды...

— Соня, ты там будзеш?

Маўчанне —потым шэпт:

— Буду...

— Ну, глядзі, Соня, калі самасудам, вы ўсе адкажаце, дарэмна вам гэта не пройдзе, адкажаце перад Саветамі і перад польскімі і нямецкімі ўладамі! Гэта вам не абы хто! Памятай гэта! Скажы гэта ім на сходзе, ці нават да сходу перамоўся з кім трэба. Скажаш?

Маўчанне, адвярнулася. І ціха:

— Скажу.

Адлягло ад сэрца. Саломінка, але не ведаю чаму — паверыла! Стараюся не задумвацца над бязглуздасцю надзеі на ўплыў Соні, непісьменнай маладой парабчанкі, праўда, пралетарскага паходжання. Так, але хто ведае? Вось з такіх і выходзілі ўплывовыя камісаркі, што ламалі хрыбціны сваіх шматлікіх ахвяраў.

Вярнулася ў камеру. Зябка, ноч доўгая, ноч цёмная і страшная. Мрояцца прывіды, катаванні, пакаранні. У гэтай цемры раптоўна зноў завалодвае якісьці нялюдскі, агідны страх, чыста жывёльны, нейкая пустата ў страўніку і ваніты. Здавалася б, у час такога поўнага спустошання неадчэпнай і супакойнай павінна была б быць думка пра Бога, малітву ці хаця б памяць пра гэта. Ды не, я нічога не адчувала тады, апрача поўнай пакінутасці, бездапаможнасці і адзіноты. Ці не для ўратавання людзей пры такім стане акамянеласці сэрца дадзена Хрыстом Малітва "Да свяціцца Імя Тваё". У нашым сэрцы. Заўсёды, ва ўсе часы, пры пакінутасці, страху, пакутах, хваробе, граху і смерці!

Прыйшла раніца — ціха. Прайшоў дзень — ціха. Нахапіўся вечар. Арыштаваных мы не бачылі. Соню ля прыбіральні змяніў салдат. Але, калі зашчымела сэрца ў чаканні і страху, на змярканні прыйшла Ядзя. І о, цуд! яе ўпусцілі! Яна прынесла хлеба, малака і прашаптала:

— Не чэпяць! Загадана адвезці ў Наваградак на суд.

Госпадзі, якая радасць залівае ўсю душу! Зноў надзея, і ўжо адчувальная. Думкі бягуць — у Наваградак! Там Міша, там Марылька, там Каця — і яны дапамогуць, і нарэшце ўбачу ўсіх! Усе мы павесялелі, бо наша доля, напэўна, агульная, і з радасці ўпершыню мы зладзілі супольнае застолле.

Зноў праходзяць дні аднастайна, здаюцца даўжэйшымі асеннія вечары. У адзін з такіх пахмурных дзён, калі на шпацыр нас не выводзілі з-за дажджу, увайшло трое салдат з вінтоўкамі. Пашыхтавалі нас уздоўж сцяны ў два шэрагі насупраць забітага акна. Хоць мы і ведалі, што павінны нас везці ў Наваградак — усе застылі на месцы... Што гэта? Расстрэл? Мільганула недарэчная думка кінуцца ў незабітае акно, кудысьці ўцякаць, дзесьці хавацца. У нас ва ўсіх, вядома, было невыноснае ўнутранае напружанне. На шчасце, гэтыя хвіліны хоць і здаваліся вечнасцю, мяркую, працягваліся нядоўга. Вайскоўцы патупалі, зыркаючы на нас, пазвякалі зброяй, пагаманілі напаўголаса і пайшлі.

Навошта ўсё гэта? Мо дзеля таго, каб кожны з нас да глыбіні адчуў сваю бездапаможнасць і сваю нікчэмнасць перад імі, прасіў злітасцівіцца, плакаў і кленчыў? Не ведаю, але, на шчасце, усе мы без выключэння сталі моўчкі, як скамянелыя... Але пасля іх сыходу мы доўга не маглі аддыхацца і сядзелі нерухома. Шумела ў вушах, кружылася галава, жыццё вярталася спакваля. Праз шчыліны забітага акна пасля дажджу свяціла апошнімі праменнямі сонца на зыходзе, і звыклы, ужо абжыты наш пакой і нары, стол, стулы нас неяк супакойвалі і вярнулі да сапраўднасці.

Кастрычнік. Восень правіла сваё права, усё часцей і часцей шумеў вецер, біў у акно касы дождж, усё больш мы хуталіся ў хусткі і пледы.

Пачалі амаль кожны дзень выводзіць кагосьці з нас з рэчамі. Развітваліся мы з цяжкай трывогай. Куды вядуць? На допыт ці выпускаюць на волю? Нашы сябры знікалі для нас як у бездань. У канцы кастрычніка засталося нас у камеры ўсяго двое. Зноў пачалі пускаць да нас дзядзьку Жуля і Ядзю. Паступова даведваюся сёе-тое пра нашых. Поль і Сяргей нібыта здаровыя, у іхняй камеры таксама стала вальней. Блізняты жывуць па-ранейшаму, але ў іх быў ператрус — нічога не знайшлі, шукалі грошы, пагражалі панне Марылі. Нянька пераехала ў адміністрацыю, панна Люцына таксама там. Пані Малішэўская — жонка нашага кіраўніка справамі — паехала з сынамі ў Наваградак, рэшта абслугі разбрылася хто куды. Мураванка ўзятая на ўлік, там па-ранейшаму ідзе праца, кажуць, зробяць саўгас. З дому мэбля даўно ўся вывезена, сёе-тое прыхавалі службоўцы і мужыкі. Юлій Эдуардавіч жыве па-ранейшаму ў адміністрацыі, іграе на раялі ці на скрыпцы; мабыць, вывязуць яго ў Маскву. Усё гэта расказана адрывіста, на хвілінных спатканнях пры перадачы харчоў. Карціць даведацца больш пра кожнага паасобку, але спытацца няма ў каго, а пры перадачах дзверы адчынены, а пры іх вартаўнік.

Час цячэ і цячэ. Раніца, дзень і бясконцая, глухая ноч!

Холад усё больш адчуваецца, асабліва калі завывае вецер і пад раніцу пажухлая трава серабрыцца шэранню. Мне прынеслі прыхаваны нянькай кажушок, футравую шапку і верхавыя боты. Ядзя крадком шэпча апошнія навіны.

— Польскае войска разбіта. 27 верасня немцы занялі Варшаву. Генерал Андэрс ранены, трапіў у палон, пакуль што ў шпіталі ў Львове. Ходзяць чуткі — яго, як і іншых афіцэраў, пасадзяць і вывезуць у Маскву (2 лістапада 1939 года каля Гродна і Любліна было арыштавана 12 генералаў, 8 тысяч афіцэраў і, больш за 200 тысяч жаўнераў польскага войска. — **Заўвага перакл.**).

Мая супольніца слухае прагна і моўчкі. Яна маладая, прыгожая, зграбна апранутая, хоць і не па-зімоваму. Пра сябе ніколі нікому нічога не распавядала, але мы ведаем, што яна праўдзівая полька, затрыманая ў першы ж дзень вайны на гасцінцы, пры ўцёках са свайго дому. Яна не размаўляе па-руску, я — папольску, але спакваля мы пачынаем разумець адна адну, і яна перастае мяне баяцца.

Як гэта дзіўна, што мы не заўважаем і не шануем свабоды, пакуль яе ад нас не адбяруць, свабоды самай элементарнай: здаецца такім цудоўным расчыніць акно, выйсці на паветра без канвою, прайсці на дарозе, куды ўздумаецца, загаварыць з кім захочацца, а галоўнае не зведваць гэтай гідотнай, панурай баязлівасці ўсяго — і цішы, і шуму, і заўсёднага тупацення за дзвярыма, і нудлівага чакання чагосьці. Чаго? Сама не ведаеш, проста невядомага і нечаканага, і пры ўсім гэтым такая прага перамены, перамены ў што б ні стала, каб не завязнуць у гэтай мёртвай нерухомасці!

Нарэшце, на пачатку лістапада ўваходзіць вайсковы, кажуць, камісар. Глянуў на нас, праверыў прозвішчы і аб'явіў:

— Заўтра раніцою збірацца з рэчамі ў Наваградак.

Вось ён, дазвол, але які? Усю ноч нам не спалася, не выходзілі з галавы розныя меркаванні і магчымасці, але ўсё ж пераважалі радасць і надзея. Радасць убачыць Поля і Сярожу — павязуць жа нас, верагодна, разам. Радасць убачыць дзяцей, а галоўнае, пачынала мацнець надзея на вызваленне.

Мы ўсталі вельмі рана. Яшчэ за акном змрок. Гарыць лямпа, мы збіраем нешматлікія нашыя рэчы, ужо чуваць за дзвярыма незвычайную валтузню. Спехам з'елі малака з хлебам. Чакаем апранутыя.

Усіх нас, мужчын і жанчын, нарэшце вывелі і сабралі на двары перад гмінай. Раніца халодная, але сухая. Нас чалавек 25. Найбольш мужчыны, сярод іх Поль і Сярожа. Упершыню бачу іх абодвух разам і зблізку.

Мікалай Лецка і яго абранніца Вуляна (мястэчка Шчорсы) падчас шлюбу.

Дазволена ісці поруч і нават размаўляць.

Звініць у вушах і кружыцца галава ад паветра і хвалявання. Мы ўтраёх трымаемся разам, і думаю, ім, як і мне, зыркая радасць цепліць сэрца! Смяёмся і маўчым, і нашы абліччы зіхацяць ад шчасця і надзеі. Пасля марудлівай пераклічкі, праверкі па спісу, таптання на месцы мы, нарэшце, рушылі ў дарогу. Я меркавала — нас павязуць на самаходах, але пайшлі пехам, акружаныя канвоем.

Поль у сваёй карычневай світцы, верхавых штанах, высокіх ботах і футравай шапцы ідзе, з цяжкасцю перасоўваючы ногі. Сярожа ў кажушку і паляўнічых ботах крочыць побач. Уражваюць іх рукі, схудалыя і слабыя. Сярожа і я падтрымліваем Поля з двух бакоў.

— Дайце яму сесці на падводу, — прашу я ўчорашняга камісара, які ехаў за намі вярхом. Ён паглядзеў, спыніў адзін воз з наваленымі рэчамі, загадаў аслабаніць месца. Поля пасадзілі на нейкія клункі. Мы з Сярожам ідзём поруч, трымаючыся за падводу. Якімсьці ціхім, больш высокім, не сваім голасам Поль прамовіў да мяне:

— А ведаеш, Волечка, я ніколі яшчэ не адчуваў такой унутранай свабоды. — І, памаўчаўшы: — Так, нейкая адасобленасць ад знешняга жыцця, ад усяго.

Хвіліну памаўчаў і працягваў:

— Няма ні тэрміновых спраў, ні прамых абавязкаў і абавязкаў перад людзьмі! Якаясьці незвычайная ў гэтым ёсць палёгка.

Здавалася б, так шмат трэба было ім сказаць патрэбнага і неадкладнага, але горла як у цісках — хоць бы не расплакацца! Вакол салдаты, ногі вязнуць у адталай гразі з'езджанай дарогі. З непрывычкі ісці цяжка. Маўчу, затое можна глядзець у вочы, усміхацца, пакратаць руку, ласкава пацiснуць схуднелыя пальцы, паправіць шарф на шыі, зашпіліць тугі гузік світкі ці кажушка; і гэта адзінае, што цяпер я здольна ім даць, а сабе здабыць такую радасць і суцяшэнне. Яны абодва ўсміхаюцца, Сярожа трымае мяне пад руку, я адчуваю ўнутраную повязь з ім.

Вакол апусцелыя восеньскія палі, нявеглыя і змрочныя. Аблятаюць з дрэваў апошнія лісты, сям-там сядзяць ці лётаюць над самай зямлёю чорныя птушкі — на дождж. Як мы павярхоўна і мала ўсё гэта адчуваем і заўважаем у спакойным, нармальным і шчаслівым жыцці. Цяпер так хочацца гэтае навакольнае жыццё ўвабраць у сябе і наталіцца ім.

Гадзіны ў тры спалудня мы з цяжкасцю прайшлі паўдарогі. Кажуць: тут паначуем. Імжыць дождж, падняўся вецер. Селішча невялікае. Ідзём па галоўнай вуліцы, рэдка хто выйдзе на ганак і адразу ж хаваецца ў хату. Напэўна, не ўпершыню праводзяць міма іх да каменіцы на два паверхі гурт арыштаваных. Асветлены падвал, вакол людзі ў скуранках. Рэчы загадана пакінуць на падводах. Нас ачапіла салдатня. Цямнее рана, пакуль нас пералічвалі, выклікаючы па спісу, і правяралі, нахапіліся прыцемкі. Тут нас раздзялілі. Жанчын асобна ад мужчын. Зырчэй свецяцца маленькія падвальныя акенцы. Па каменных сходах мужчын спускаюць у падзямелле. Страшна глядзець, як яны знікаюць адзін за адным, згінаючыся, каб не стукнуцца аб вушак дзвярэй. Зноў гэтае адчуванне страху і бездапаможнасці.

— Пусці мяне з мужам! — прашу я чалавека са спісам у руцэ, але салдаты мяне адпіхваюць і скаляць зубы:

— Нічога! Ты, нябось, сабе другога знойдзеш!

Па распараджэнні чалавека са спісам мяне пад канвоем адводзяць да якіхсьці напаўразбураных пустых хатаў. Не ведаю, куды замкнулі іншых жанчын, але мяне завялі ў двор адну. Там у куце — клетка, мяркую, для курэй. Метр шырынёй, метр даўжынёй, спусцістая страха, дзверы з адтулінай зверху, нібы маленькае незашклёнае акенца. Дзверы зачынілі, зашчоўкнулі кручок, прыставілі вайскоўца вартаваць. У гэтай клетцы — ні сесці, ні легчы. Ток земляны. Можна толькі прыхінуцца да задняй сценкі, у якой падабенства да курасадні.

Гэтая ноч — з думкамі пра змрочны падвал, ачэплены ўзброенай салдатнёй, з трывожнымі меркаваннямі і прадчуваннямі была б яшчэ больш страшнай і нават трагічнай, каб не Ядзя.

Калі зусім сцямнела, зацяклі ногі і, нягледзячы на пальчаткі, застылі і забалелі ад холаду пальцы, пачула я раптам шоргат, рух і шэпт за дзвярыма. Выцягнулася на пальчыках, гляджу ў акно. Успыхвае ў цемені цыгарэта майго ахоўніка і асвятляе захутаную ў хустку постаць. Узбіраюся. Госпадзі, дык гэта ж Ядзя!

— Пусці, кажу, — шэпча яна.

— Не загадана! — адказвае шэптам салдат.

— Пусці, ты ж побач, на табе махоркі!

Пасля працяглага гандлю чую — здымае кручок. Праз ледзь прыадчыненыя дзверы працягваецца рука.

— Вось вам, графіня! — і суне мне пакунак вялізных канапак з запечанай курыцай.

— Не бойцеся, — шэпча яна, — мужчын будуць палохаць, праходзячы з вінтоўкамі ўздоўж падвала, можа, да іх і зойдуць, але нікога не крануць, загадана ў цэласнасці даставіць у суд.

— Пагавары ў мяне! — шыпіць салдат, стараючыся зачыніць дзверы і адцягнуць Ядзю.

Гляджу ў акно. Успыхвае папяроса. Ядзя смяецца яму ў твар, і ён ёй таксама ўсміхаецца у адказ:

— Дзякуй табе, любая, — крычу я ёй, баючыся называць па імені.

Ядзя, якая славілася ў Шчорсах дзяўчынай лёгкіх паводзін і з якою ніхто не адважваўся на паважнае, бо яе натура не ўкладвалася ў рамкі трафарэтнай дабрадзейнасці, маладая, паглядная, прыгожая, вясёлая і смелая, сапраўдная полька, не паленавалася і не пабаялася пасведаваць за намі, каб выявіць сваё спачуванне, падбадзёрыць і словам і ласкай. І як яна мяне знайшла? У цемры, сярод салдат, у якімсьці глухім закатулку? Колькі трэба было хітрасці, храбрасці і рашучасці, каб здолець абдурыць вартавых!

Усё паўставала цяпер у іншым святле. Вось што значыць ласка і спачуванне. Разгортваю канапку — якая смачная курыца! І скарыначка хрумсціць, і свежы свойскі хлеб. Здаецца, я ніколі не ела такой смакаты. Усё гэта падрыхтавана з любасцю, з думкай пра нас, з жаданнем дапамагчы. Якое шчасце жыць на зямлі! З любоўю, з ласкай, цяпер вось і з надзеяй, што ўсё абыдзецца, што нас, магчыма, — не, нават напэўна, — проста адразу ж адпусцяць, і мы ўсе разам рушым у Варшаву!

Спаць тут, вядома, немагчыма. Ды гэта не так ужо і важна. На таку ляжаць загорнутыя ў чыстую сурвэтку канапкі для Поля і Сяроржы. І, усміхаючыся, мару, як іх кране і ўзрадуе мой аповед пра Ядзю. Узышоў месяц, пэўна, дождж супыніўся. Свеціць ясненькі ў маё акно, і вось ужо бачны акрайчык неба, а мой салдат, прыхінуўшыся да дзвярэй, сядзіць на зямлі і пахрапвае, паклаўшы вінтоўку на калені. Усё ціха, пахне зямлёй і прэлым лісцем. Стрэлаў не чутно. Дзякуй Богу! Верагодна, і мае там заснулі. Паспрабую і я — спяць коні стоячы. І незаўважна для сябе, сеўшы на зямлю, падкурчыўшы ногі, ці то задрамала, ці проста знепрытомлела без думак і страху...

Было яшчэ цёмна, калі я пачула, як звягнуў кручок маіх дзвярэй.

— Выходзь! — кажа салдат і, адчыніўшы насцеж дзверы, прапускае мяне наперад. Золка, не ратуе кажушок. Здзервянелі ногі, ныюць каленцы. Дарога сухая, пад раніцу падмарозіла, паўсюль нейкая волкая імжа. Са страхам думаю — як яны там пеpажылі ноч у сырым падвале. Вывелі і мужчын, аднекуль з'явіліся і нашы жанчыны. Дапытліва пазіраю на сцятыя твары Поля і Сярожы.

Камісары, выкрыкваючы прозвішчы, праверылі нас па спісу, зноў пералічылі, і доўга яшчэ мы соўгаліся на месцы, тупаючы нагамі, стараючыся сагрэцца, размяць зацеклыя рукі і ногі. Пад'ехалі, нарэшце, падводы. Поля зноў уладкавалі на воз, і мы рушылі ў дарогу. У хатах сям-там ужо мігціцца святло, але вуліца пустая — не чуваць ні пеўняў, ні сабак.

Сярожа і я ідзём поручкі, стараючыся не адставаць. Гляджу на яго і Поля. Намагаюся ўгадаць, як прайшла ноч. Яны маўчаць, а я не распытваю, нельга — пэўна, кепска.

Ратуюць канапкі — яны ж нічога не елі. Ціха ім расказваю пра Ядзю. Квола з удзячнасцю ўсміхаюцца, дзеляцца ежай з нашымі суседзямі. Вартаўнікі бачаць, але не пярэчаць. Сонца ўжо ўзнялося, пасвятлела неба, на ўсходзе ружавеюць воблакі. Будзе, верагодна, ясны дзень. Добра ісці раніцай. Ногі пажвавелі, рукі сагрэліся, нават гараць, гразі няма, суха, паветра чыстае, марознае, але галоўнае — наперадзе надзея пабачыць дзяцей, даведацца наконт блізнятаў. Але адкуль такая ўпэўненасць, што нас адпусцяць — вядома ж, адпусцяць! Казалі ж нам, што няма складу злачынства. Ціха ім кажу пра гэта, і яны таксама спадзяюцца і глядзяць весялей.

Вось ужо ўдалечыні і Наваградак, высіцца гара з развалінамі замка, купал праваслаўнага сабора. Усё часцей і часцей сталі трапляцца нам насустрач вершнікі, цягнуцца падводы, абганяюць самаходы. Наша ахова згрупавалася бліжэй і адціснула нас да правага краю дарогі. Мы расцягнуліся доўгім гуртом. Усе глядзяць наперад, ідуць бадзёра, але заўважна і занепакоенасць. Вось і сам горад. Рухаемся па галоўнай вуліцы. Мінакі прыпыняюцца, прапускаючы нас наперад, праводзячы спачувальнымі позіркамі. Вось справа Еўрапейскі гатэль, вось і плошча, такая знаёмая, і гандлёвыя рады з іх непамерна тоўстымі калонамі, цяжкім дахам. Але дзе ж крамы з прадаўцамі, што заўжды зазывалі да сябе? Дзе тыя лаўкі з разнастайнымі прысмакамі, дзе базары з дарамі сялянскіх ніў? Усё пазачыняна. Вітрыны наглуха забіты. Увесь горад нібыта вымер. Зусім чужы, панылы і закінуты, людзей мала, нават у цэнтры. Мы цясней згуртаваліся. Поль злез з падводы, ідзе побач са мной.

І раптам, нечакана перахапіла дыханне ад радасці! Хто мог перадаць, што ў Наваградак прыгоняць партыю арыштаваных "врагов народа"? Хто папярэдзіў і ўсё падрыхтаваў да нашага прыходу? Марылька і Каця ў кажушках і хустках, такія маладыя, чыстыя, прыгожыя, праз слёзы ўсмешлівыя, стаялі пасярод дарогі, чакаючы нас з вялізнымі гладышамі гарачай салодкай кавы з малаком і з тоўстымі скібамі духмянага белага хлеба.

Мы ўсе застылі, як зачараваныя. Ахова зніякавела патупала, але і яна не ўстаяла, не адмовілася паспытаць пахучай кавы з хлебам. Усім нам налівалі і далівалі ў прынесеныя кубачкі, шклянкі і конаўкі. Бывае ж такая суцеха і радасць! Адчувалася душэўная любасць і мілата, што ўсім хацелася плакаць.

— Давай! Давай! — раздаўся савецкі вокліч, такі яшчэ нам нязвыклы. Гарлапанілі толькі што падаспелыя міліцыянты. Ахова наструнілася, Марылька і Каця адступілі і доўга яшчэ праводзілі нас вачыма, а мы пашлэпалі далей, не паспеўшы сказаць адно аднаму ніводнага слоўца. Усё ж мяркую, што нашыя вочы, блішчучы слёзамі радасці і ўдзячнасці, прамовілі ім больш за самыя ласкавыя словы. А ў душы ў мяне запанавала ўрачыстая святасць, і здавалася, што гэтую нечаканую радасць пагасіць немагчыма...

Падышлі да ўскраіны горада. Тут спыніліся перад вялікім двухпавярховым будынкам. Падыходзім да шырокіх прыступкаў з камянёў. Падымаемся па сходах густым натоўпам. Уваходзім у разнасцежаныя перад намі двухстворкавыя дзверы. Упускаюць па два чалавекі. Вакол узброеная ахова. Вялікая квадратная вітальня поўная народу. Высокая столь, пасярэдзіне шырокія сходы, што вядуць на другі паверх. Тут стоўпіўся наш увесь гурт, тут і іншыя арыштаваныя. Ля дзвярэй ля сходаў стаяць вартавыя з вінтоўкамі. Уся падлога заследжана бруднымі ботамі. Сесці няма дзе — усе стаяць. Ля прыступкаў сходаў два камісары ў скуранках і пры рэвальверах. Яны, са спісамі у руках, выклікаюць паімённа арыштаваных. Ужо шмат хто пайшоў. Камісары іх абшукваюць, правяраюць па спісе, нядоўга напаўголаса раяцца. Кабет і зусім маладых мужчын пераважна адпускаюць на волю. Адразу ж салдаты выводзяць іх праз выходныя дзверы на двор. Іншых затрымліваюць, і канваір вядзе такіх па сходах угору. Куды, ніхто не ведае. І мы са страхам і трывогай сочым за імі вачыма. З нашага гурта першым называюць Сяроржу. Пагутарыўшы — адпускаюць. Адлягло ад сэрца! Ён няўцямна аглядваецца на нас, але яго ўжо павялі на вуліцу. Потым выклікаюць мяне — параіўшыся міжсобку, таксама адпускаюць. Выклікаюць маю сажыцельку — і таксама вызваляюць.

Тут прыводзяць новую партыю арыштаваных. Таўкатня, месца мала. Я хаваюся за чужыя спіны, прабіраюся да Поля. Неспакойнымі вачыма ён глядзіць на мяне. Гэтага позірку я, здаецца, ніколі не забуду. Яго выклікаюць — паспела толькі пацiснуць яму руку. Чакаю з заміраннем сэрца... Паразмаўлялі нядоўга. Чую жахлівае слова — "Угору"! Два салдаты па баках, Поль пасярэдзіне. Шырокія слізкія сходы і стук абцасаў. Усё. Поль схаваўся за дзвярыма. Як цяпер бачу яго злёгку прыгнутую спіну і нахілёную галаву. Пасярэдзіне сходаў ён азірнуўся, але наўрад ці прыкмеціў у натоўпе маё ашаломленае аблічча.

Я засталася, спадзеючыся, што пасля допыта Поля адпусцяць. Стаю ззаду ля сцяны. Міма ўсё ідуць і ідуць арыштаваныя. Адны — у знадворныя дзверы, іншыя ўгору. Цямнее. Запалілі святло, радзеюць людзі. Ужо была змена варты і камісараў, а мы ўсё стаім і чакаем. Адчуваю нейкую прывіднасць, з аднаго боку — такая доўгачаканая свабода, а з іншага — пякучая турбота наконт Поля. Зусім стала пуста, уваходныя дзверы зачыняюць. Да мяне падыходзіць камісар.

— Ну, чаго чакаеце? — кажа ён. — Патрымаюць да заўтра, там разбяруцца!

Сяго-таго з пазасталых і мяне выштурхоўваюць на двор.

Холадна, зябка, цёмна, ціха падае мокры снег і адразу ж растае пад нагамі. Цьмяна асвятляе ліхтар даўно непадмецены ходнік. У паўзмроку выхопліваю постаці дзяцей. Яны яшчэ нічога не ведаюць — спадзяюцца! Яны ўвесь дзень па чарзе вычэквалі нас ля выхаду. Але я іду да іх адна. Усё зразумела без слоў.

Як я правяла гэтую першую ноч майго вызвалення — проста не памятаю. Ведаю толькі, што ўсё яшчэ доўга кволілася ў душы спадзяванне, што Поля выпусцяць з турмы. "За неимением состава преступления" — усё паўтарала я кімсьці сказаныя мне словы суцяшэння. Былі мы тады ўсе вельмі даверлівымі і наіўнымі. Я і думкі не мела, што ўбачу Поля толькі праз сем гадоў у Францыі.

Пераклад Таццяны і Яўгена ЛЕЦКАЎ.

АД РЭДАКЦЫІ

Шаноўныя чытачы! Калі вас зацікавіў расповед графіні Вольгі Храптовіч-Буцянёвай і вы жадаеце пазнаёміцца з працягам яе ўспамінаў — раздзеламі "Наваградак" і "Казахстан", — напішыце нам.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
9 ЛІСТАПАДА 2011 г.

СВЕЦКАЯ ХРОНІКА

«Лістапад» за зачыненымі дзвярыма

На адкрыццё Мінскага міжнароднага кінафестывалю “Лістапад-2011” пускалі толькі па прапусках.

Мінулагодні кінафестываль “Лістапад” быў сапраўднай падзеяй у мінскай культурніцкай прасторы. Пад дробным лістападаўскім дожджыкам па чырвоным дыванку праходзілі замежныя госці і айчынныя акцёры, а на сцэну пад агульныя авацыі выйшла сама **Арнела Муці**. За хараставо знакамітай італьянкі, майстар-класы рэжысёра **Эміра Кустурыцы** і іншыя прыемнасці год таму аддалі каля паўтара мільярда беларускіх рублёў.

Сёлетні “Лістапад” зусім іншы. Безумоўна, крызіс не мог не паўплываць на планы арганізатараў. У праграме няма сапраўды зорных імёнаў, знакамітасцяў можна сустрэць толькі на адкрыцці і пералічыць па пальцах.

Само адкрыццё было даволі сціплым. Цырымонію вялі расійская актрыса **Вольга Кабо** і акцёр Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі **Дзяніс Паршын**. На сцэну выходзілі галоўныя госці фестывалю — **Кахі Каўсадзэ** (выканаўца ролі Абдулы ў кінафільме “Белае сонца пустыні”), **Веніямін і Аліка Смехавы**. Прысутных у зале песнямі павесяліў гурт “Горад 312”, віртуозным валоданням скрыпкі — PALLADIUM electric band.

Калі чытач здзіўлена адкладзе газету ўбок і запытае сам сябе, чаму “Народная Воля” паведамляе толькі агульнавядомыя факты аб цырымоніі адкрыцця, мы ў сваю чаргу адашлём яго ў Міністэрства культуры. І гэта не мы блытаем божы дар з яешняй. Так атрымалася, што Міністэрства культуры зараз вырашае, азнаёмяцца чытачы “Народнай Волі” з тым, што адбывалася на адкрыцці “Лістапада”, ці не. Менавіта рашэннем гэтай установы нам патлумачылі прычыну, па якой наша выданне не патрапіла на самую яскравую частку фестывалю. Цікава, што без прапускоў засталіся і некаторыя іншыя СМІ.

Прэс-служба “Лістапада” толькі разводзіць рукамі: маўляў, дачынення да адкрыцця і закрыцця яны амаль не маюць. Затое нам прапанавалі звярнуць асаблівую ўвагу на чырвоны дываноў. Сапраўды, пачатак цырымоніі быў афармлены з густам. Дываноў быў шырэйшым, чым год таму, аздоблены лямпамі і турнікетамі для гледачоў. Шчыра прызнацца, разявак таксама было больш, чым у мінулым лістападзе. Паспрыялі надвор’е і добрая рэклама. За некалькі дзён да пачатку фестывалю па тэлебачанні, радыё і нават у метро гучалі заклікальныя ролікі. Між тым нават з рэкламадаўцамі пабудаваць нармальныя адносіны ў арганізатараў “Лістапада” не вельмі атрымліваецца. На прэс-канферэнцыі перад адкрыццём фестывалю прадстаўніку аднаго з галоўных спонсараў фэсту не знайшлося месца ў прэзідыуме. Дый большасць журналістаў, мякка кажучы, не была ўражана працай прэс-цэнтра. Напярэдадні фестывалю не атрымалася паразмаўляць ні з анансаваным **Андрэем Звягінцавым**, ні з іншымі знакамітасцямі.

У рэшце рэшт, патлумачыць нам, чаму “Лістапад-2011” пачаўся за зачыненымі дзвярыма, так ніхто і не здолеў. Мямлілі пра “не склалася” і “так атрымалася”. Што само па сабе сведчыць пра “высокі еўрапейскі ўзровень фестывалю”, калі вы разумееце, аб чым я...

Марыя МАЛЕВІЧ.
Фота *photo.bymedia.net*

ПАРАЛЕЛІ

Алег Качан адпачывае як зорка?

“Народная Воля” паспрабавала знайсці еўрапейскі гатэль, які б адказваў патрабаванням беларускага міністра спорту і турызму.

Міністр спорту і турызму Беларусі **Алег Качан** на адкрыцці выставы “Турбізнес у Беларусі”, адказваючы на пытанне пра высокія цэны ў гатэлях Мінска, выказаў меркаванне, што 200 долараў за суткі ў гатэлі — гэта нядорага.

“Я нядаўна вярнуўся з камандзіроўкі, дзе жыў у нумары за 230 долараў, — цытавала інтэрнэт-газета “Салідарнасць” Качана. — *І я вам скажу, што нашы нумары выглядаюць лепш”.*

Па нашых падліках, адпачываў Качан не менш як у пяцізоркавым гатэлі. Для параўнання: 121,5 еўра прыйдзецца заплаціць жадаючаму пасяліцца ў адным з самых шыкоўных гатэляў **Вільні** Radisson Blu Astorija. Гатэль больш як са стогадовай гісторыяй змяшчаецца каля віленскай ратушы ў самым цэнтры старога горада.

Кошты ў самым дарагім гатэлі **Варшавы** Rialto пачынаюцца ад 115 да 209 еўра за аднамесны.

За аднамесны нумар у шыкоўным кіеўскім гатэлі Hyatt Regency Kiev прыйдзецца заплаціць 264 еўра. Але ў вашых **кіеўскіх апартаментах** будзе кававaрка, тэхнічнае абсталяванне найвышэйшага ўзроўню і нават джакузі ў ваннай.

Спыніўшыся ў **Парыжы**, напрыклад, у Franklin Roosevelt Hotel, дзе аднапакаёвы нумар каштуе 221 еўра, можна забыцца на клопаты. За дзецьмі прыглядзіць нянька, за здароўем будзе сачыць урач, аб вопратцы паклапоцяцца ў пральні гатэля.

Круглыя суткі клапаціцца аб вашай бяспецы будуць у пяцізоркавым **лонданскім** гатэлі Dukes. Ды што там казаць, ваш ложак нават падрыхтуюць да сну, толькі б вы былі згодныя аддаць 222 еўра за ноч.

А зараз вернемся ў родныя пенаты. Пакуль у Мінску толькі два пяцізоркавых гатэлі — новаадбудаваная “Еўропа” і “Краун Плаза”. Праўда, да міжнародных стандартаў абодва гатэлі не дацягваюць — няма верталётнай

пляцоўкі... Між тым у “Еўропе” за 305 еўра вам прапануюць прыгожы нумар у цэнтры горада і, бадай, усё. Ёсць у гатэлі і нумары з джакузі і індывідуальнай саўнай, але гэта ўжо прэзідэнцкі клас.

Нумары катэгорыі “люкс” гасцініцы “Краун Плаза” разлічаны на двух чалавек. У спіс дадатковых паслуг нумароў гэтай катэгорыі уваходзяць галасавая пошта, заказ фільмаў, выбар падушак, дываноў, а ванны пакой абсталяваны душам і ваннай, а таксама дадатковымі туалетнымі сродкамі. Кошт нумара ад 310 да 453 еўра.

Затое ў рэгіёнах усё па-іншаму. У Оршы, напрыклад, толькі два месцы, дзе можна пераначаваць. Гэта непасрэдна гатэль “Орша” і турыстычная база. На турбазе 60 тысяч каштуе адно койка-месца ў блоке на чатыры ложкі. За сімвалічную даплату можна заказаць сняданак, прайсці аздараўленчыя працэдуры.

Атрымліваецца, што амаль за адны і тыя ж грошы ў Беларусі і Еўропе можна атрымаць зусім розны сервіс. Магчыма, спадар Качан ведае тыя месцы ў нашай краіне, дзе 200 долараў за нумар — гэта танна і адэкватна паслугам...

Марыя МАЛЕВІЧ.

«Ляпис Трубецкой» представил клип «Не быць скотам»

Это первый сингл из будущего альбома “Ляписов” и первая песня в истории группы, написанная ее лидером Сергеем Михалком на стихи Янки Купалы.

“Я долго не мог подступиться к этому стихотворению, ведь здесь в нескольких строчках заложен эпос и история целого народа, — рассказывает Сергей Михалок. — *Меня потрясло, что стихи, написанные много лет назад, и сегодня звучат очень актуально. Забавно, что Купала может подсказать всем белорусам, что делать и как жить здесь и сейчас, — причем лучше, чем любые речи современных политиков.*

Я сознательно изменил название песни. У нас она называется “Не быць скотам”, а не “Хто ты гэткі?”, как у Купалы. Потому что для меня сейчас “Не быць скотам” — это не быть жвачным животным, равнодушным ко всему, что творится вокруг, и довольным содержимым своей кормушки. Я даже себе татуировку сделал с этой фразой — на животе”.

Новый клип “Ляписов” можно увидеть в интернете.

АНОНС

«Вопли Видоплясова» отпразднуют день рождения в Минске

14 декабря в рамках юбилейного тура в Минск приедет знаменитая украинская рок-группа “Вопли Видоплясова”. В большом зале Дворца Республики коллектив представит специальную программу “День народження”, в рамках которой публика услышит все самые любимые песни за 25 лет.

Группа была основана в 1986 году в Киеве и стала одним из символов украинской рок-музыки, а многие песни — по сути народными. Позади 25 лет и тысячи концертов, но они по-прежнему в форме, которой могут позавидовать многие молодые группы.

— *Думаю, это феномен горца и желание всегда быть в бою,* — объясняет лидер “Воплей Видоплясова” Олег Скрипка. — *Важно быть целеустремленными и держаться друг за друга. Понятно, что в особые сантименты мы уже не пускаемся, но когда тур, сольные концерты, я вижу, как у музыкантов перед выступлением загораются глаза, появляется огонек. Для меня это контрольная сигнальная лампочка, что мы занимаемся правильным делом. Вообще “ВВ” в большей степени концертная команда. Мы понимаем, что студия — это важно, что нужно фиксировать там материал, но главное для коллектива — это концерты. Они не дают застаиваться крови и позволяют получить обратную связь.*

С Беларусью у группы особые отношения, что лишний раз подтвердилось пару месяцев назад, когда “Вопли” представили белорусскоязычную версию песни “Краіна мрій”. Юбилейный концерт в Минске также будет особенным — “Вопли Видоплясова” привезут с собой не только фирменный гитарный драйв, но и этно-бэнд Le Grand Orchestra.

— *Это будет расширенная версия нашей юбилейной программы. Прозвучат самые популярные, самые знаковые песни разных лет, но помимо электрической части в ней будет специальный фольклорный блок, который мы сыграем вместе с музыкантами Le Grand Orchestra. Будет больше этнических инструментов, больше украинского колорита, если хотите. Это абсолютный эксклюзив — мы еще не играли в таком составе даже в Украине.*

Билеты на концерт стоят от 60 до 180 тысяч рублей.

ШОУ-БИЗНЕС

Конкурс полной чашей

Недалек тот час, когда отечественный шоу-бизнес будет окормлен своей собственной Национальной музыкальной премией. К сожалению, пока она рождена и живет без имени, но главное — ввязаться в бой. Награждение победителей все желающие смогут посмотреть 13 декабря во Дворце Республики, а потом и по телевизору. А ныне заканчивается прием заявок на участие в этом “ристалище” — надеемся, артистов, а главное, талантов хватит для организации “большого события”, на которое так рассчитывают его организаторы — Министерство культуры и ЗАО “Столичное телевидение”.

На днях по этому поводу была проведена пресс-конференция. И не где-нибудь, а в музее имени **Владимира Мулявина** в Белгосфилармонии: стены и дух музея должны были внушить собравшимся уважение к первому конкурсу эстрадного искусства, так сказать, “позолотить” эту идею бессмертной славой Владимира Георгиевича. Что ж, правильная раскрутка — аншлага половина. В президиум пригласили даже директора музея **Светлану Александровну Пенкину-Мулявину**. Но слова не дали. И лично я, зная строгий нрав вдовы Мулявина, предположу, что если бы Светлана Александровна выступила, то не с преждевременными фанфарами, а с критикой современного эстрадного искусства. Впрочем, если в письменном виде, то даже критика на этот раз приветствоваться будет — музыкальный журналист тоже имеет возможность получить на конкурсе премию, потому что в условиях предусмотрена и такая номинация.

Вообще “захват” конкурса самый что ни есть широкий (смотрите официальный сайт Молодежного театра эстрады, где размещены все документы). Кроме исполнителей, будут отмечены и поэты, и аранжировщики. И продюсеры, и клипмейкеры. Отдельно женщины, отдельно мужчины. Группы и солисты. Молодые и маститые... Номинаций всего 16. Вопрос, захотят ли мэтры (тот же **Игорь Михайлович Лученок**, например) участвовать в гонке за первую музыкальную? Заполнять анкету, подавать документы? Ему-то зачем? “Сами заполним, мэтру только на подпись отнесем! И это нормально!”, — заверил замдиректора СТВ **Павел Кореневский.** Чувствовалось, что на самотек он не пустит ничего в этом проекте.

Чуть подгримированный, явно заточенный на перманентный успех, в модных ботинках на белой подошве, замдиректора энергично и с чувством солировал на пресс-конференции, как бы кодируя этот большой проект на удачу. По-братски хватая за плечи то первого зам. министра культуры Карачевского, то народного артиста Тихановича, и называя его фамильярно Сашей, а супругу его Ядей (как говорится, “с Пушкиным на дружеской ноге”), Павел Кореневский заверил, что в работе над конкурсом сейчас задействованы все лучшие силы: гала-концертом занимаются лучшие режиссеры, лучшие продюсеры, лучшие художники. Скульптором **Андреем Хотяновским** создан символ конкурса — статуэтка-звезда. **Евгением Алейником** написана прекрасная увертюра к празднику... *“Вас все удивит: новые песни, новые лица на сцене и даже одежда ведущих. Это будет не обыкновенная раздача слонов,* — вдохновенно заинтриговывал замдиректора, — *а... нечто сродни Голливуду!”.* Ух! И сидящий рядом **Александр Тиханович** предположил: *“И главную премию дадут Павлу Кореневскому!”* Он парировал: *“Но я же не пою!”* И мне показалось, что где-то в голосе его прозвучала даже нотка сожаления об этом.

Как говорится, такую бы энергию, да в хозяйственных целях... Впрочем, надо отдать должное руководству СТВ: у него есть успехи в создании больших музыкальных проектов, гала-концертов, и, что важно, не лицензионных, а авторских. Пожелаем успеха и этому детищу, Национальному конкурсу эстрадного искусства. Государство вкладывает в него не маленькие средства (хотя цифры и несколько поблекли в связи с известными событиями): “Лучшая песня года” оценится в итоге в 95 базовых величин (3.300 000 рублей), остальные номинации — в 62 базовые величины.

В конце вспомню слова певицы **Ани Шаркуновой**, которая присутствовала на пресс-мероприятии, и как-то очень проникновенно сказала: *“Я хочу использовать момент и сказать спасибо организаторам конкурса за то, что люди не опускают руки, работают и дают возможность нам, артистам, честно продвигаться в шоу-бизнесе. Многие не верят в такую возможность. Но в нашей стране это реально. Конечно, артист работает за деньги. Но ему нужно и другое поощрение — победа на конкурсе, на соревновании! И я хочу, чтобы первая Национальная музыкальная премия легко не доставалась никому! Пусть предстоящее соревнование будет честным и трудным”.*

Елена МОЛОЧКО.

ПОПСА

Вадим ГАЛЫГИН:

«Работа артиста очень похожа на проституцию»

После долгих лет дружбы музыкант Илья Митько и шоумен Вадим Галыгин решили выйти на новый уровень отношений. Результатом исключительно творческого союза стал новый музыкальный альбом “Подарок”.

Про службу и дружбу, любовь и скандалы Галыгин и Митько честно рассказали своим поклонникам и журналистам.

Спой, светик...

Быть знаменитым и не петь — в среде российского бомонда и эстрадных кругов едва ли не моветон. Что тут скажешь, если даже премьер-министр России **Владимир Путин** не считает зазорным петь для народа... Так что неплохо засветившемуся в Златоглавой **Вадиму Галыгину** сам бог велел заняться вокалом. Тем более что на выручку к старому товарищу пришел музыкант и лидер группы “Леприконсы” **Илья Митько**.

Первый совместный альбом шоумена и “Леприконсов” стал сюрпризом для многих. Прежде всего для некоторых музыкантов, которые не то чтобы услышали в композициях мотивы своих песен, но все же почувствовали какую-то связь.

— *Когда Вадим показал мне наброски песен, то сразу стало видно, что слушал человек в последние десять лет,* — рассказал Илья Митько. — *В одной песне я услышал “Кино”, в другой — “Технологию”. Но в этом-то и была идея! Так сложилась концепция: каждая композиция станет подарком от Вадима Галыгина определенному исполнителю.*

— *Идея в том, что у того или иного музыканта могла быть такая песня,* — добавил Галыгин.

Не все песни в альбоме посвящены творчеству других коллективов. “Безадресных” композиций, выражаясь словами Ильи Митько, накидали “до кучи”. Так как музыка — понятие сугубо нематериальное, то песни Галыгина и “Леприконсов” тоже нельзя пощупать. Пока альбом распространяется только в интернете и, что приятно, совершенно бесплатно.

К слову, о деньгах. Галыгин старается заранее оговаривать финансовые вопросы со своими деловыми партнерами.

— *Всегда нужно заранее договориться, как будем делить радости и невзгоды,* — делится шоумен. — *Или вообще не будем делить. На заработанные деньги, например, снимем клип для нашей группы. Тогда все просто, но об этом надо разговаривать. Мне не раз приходилось сталкиваться с тем, что бизнес с другом заканчивался плачевно. Думаешь, что как-то неудобно с товарищем говорить о деньгах, но, поверьте, с этого всегда нужно начинать. Маленький момент неудобства пройдет, но вы все решите сразу. Тогда не будет ни расставаний, ни судебных тяжб.*

Дорого — это сколько?

Если на вопросы о карьере и даже неудачном опыте выступлений Галыгин отвечал не таясь, то тайны личной жизни открывать не захотел. Признался лишь, что не общается с бывшей женой Дарьей, хоть и говорил когда-то о том, что при расставании они сохранили теплые отношения.

Не распространяется Вадим и о своей нынешней семейной жизни. В мае шоумен впервые стал отцом, а его супруга певица **Ольга Войнилович** приняла участие в записи альбома “Подарок”. Пожалуй, это все, что известно про сегодняшние отношения молодой пары. Ну, может быть, еще то, что этот Новый год Вадим собирается наконец-то провести дома. Если, конечно, долг не призовет к работе.

— *Понимаете, работа артиста очень похожа на проституцию,* — констатировал Галыгин. — *Главное — цена вопроса. Позвонят с предложением, от которого трудно отказаться, и буду работать...*

Илья Митько также признался, что в новогодние праздники будет работать, хоть хотел провести праздничный вечер с женой, подросшим сыном, сестрой и ее детьми. Как признался музыкант, *“хотелось бы побыть Дедом Морозом для своих”.* Кстати, артисты пока не озвучивают свои гонорары за новогодние корпоративы. Говорят только, что стоят дорого.

Мария МАЛЕВИЧ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
9 ЛІСТАПАДА 2011 г.

ВНЕ ИГРЫ

Есть еще в жизни место подвигу

Вратарь футбольной испанской “Барселоны” Виктор Вальдес установил клубный рекорд по продолжительности “сухой” серии, установленный в сезоне-1972/73 Мигелем Рейна.

Вальдес превзошел это достижение в выездном матче Лиги чемпионов с чешской “Викторией”, пишет издание El Mundo Deportivo. “Барселона” победила со счетом 4:0.

Рекорд, принадлежавший Мигелю Рейна, составлял 824 минуты. Чтобы побить рекорд, Вальдесу нужно было не пропустить гол в течение 38 минут матча с “Викторией”. На 17-й минуте игрок чешской команды вышел с голкипером один на один, но Вальдес отразил удар. Теперь рекорд составляет 876 минут и может быть улучшен.

В последний раз Вальдес пропустил гол 22 сентября в выездном матче чемпионата Испании с “Валенсией” (2:2). На 23-й минуте второй гол в ворота “Барселоны” забил Пабло Эрнандес.

Мигель Рейна, рекорд которого побил Вальдес, играл за “Барселону” в 1966—1973 годах. Его сын Хосе Рейна в настоящее время является вратарем “Ливерпуля”.

В матче “Виктория”—”Барселона” лидер испанской команды Лионель Месси забил три гола и превысил отметку в 200 голов за клуб. Теперь на счету Месси 202 гола. Кроме того, этот матч стал 200-м для Хосепа Гвардиолы на посту главного тренера “Барселоны”.

В Лиге чемпионов “Барселона” выступает в группе H вместе с “Миланом”, “Викторией” и белорусским БАТЭ. После четырех туров у “Барселоны” десять очков, у “Милана” — восемь, у БАТЭ — два, у “Виктории” — одно. “Барселона” и “Милан” уже обеспечили себе выход в 1/8 финала.

История остается...

В Венгрии скончался 70-летний Флориан Альберт, бывший футболист “Ференцвароша” и сборной страны, который в 1967 году получил приз лучшему футболисту Европы — “Золотой мяч”.

Об этом сообщает официальный сайт “Ференцвароша”. Причины смерти Альберта не называются, однако, как уточняет Associated Press, не так давно он перенес операцию на сердце.

Альберт играл в “Ференцвароше” всю свою карьеру. Он выступал за эту команду с 1958-го по 1975 год, провел в ней 537 матчей во всех турнирах и забил 383 гола. В составе этого клуба Альберт четырежды стал чемпионом Венгрии. В 2007 году стадион “Ференцвароша” был назван в честь форварда.

За сборную страны Альберт провел 75 матчей и забил 31 гол. Альберт принял участие в чемпионатах мира 1962 и 1966 годов, а на Олимпийских играх 1960 года выиграл бронзу.

Нужна в футболе, между прочим, голова

Японский футболист Рюдзиро Уэда забил гол ударом головой со своей половины поля.

Это произошло в матче второго дивизиона чемпионата Японии между командами ФК “Йокогама” и “Фагиано Окаяма”. Гол играющего за “Окаяму” Уэды оказался единственным в матче, сообщает интернет-издание Goal.com.

На 69-й минуте вратарь “Йокогамы” Кентаро Секи выбил мяч от своих ворот, и Уэда сильным ударом головой отправил мяч на чужую половину поля. Мяч, ударившись о землю, перелетел через Секи и оказался в воротах.

После матча было установлено, что Уэда нанес точный удар с 58,6 метра. Предположительно этот гол является рекордсменом по дальности удара для мячей, забитых головой. Ранее рекордным считался гол, забитый около месяца назад в матче второго дивизиона чемпионата Норвегии с 57,3 метра.

Уэда после игры признался, что забил гол случайно. По словам защитника, он выбил мяч на чужую половину поля, после чего побежал на свою позицию. Через несколько секунд Уэда увидел мяч в воротах соперника и понял, что забил гол.

Александр НИКОНОРОВ.

ПО ПОВОДУ

Шеф, не провалите явку!

С 10 по 12 ноября в Гомеле пройдет шестой Международный турнир по хоккею «Кубок Полесья». К «директивному наполнению» трибун готовятся уже сейчас...

Известно, что история этого турнира началась именно в Гомеле, в феврале 2007 года. В первом розыгрыше Кубка принимали участие сборные Беларуси и Латвии, уфимский клуб “Салават Юлаев” и любительская команда из Канады “Пауэлл Ривер Регалз”.

Последний розыгрыш Кубка стал неудачным для белорусов — наша команда стала второй, а трофей достался сборной Дании.

В этом году у подопечных нового главного тренера сборной Беларуси — финского специалиста Кари Хейккиля — будет возможность получить реванш. Сейчас в розыгрыше Кубка примут участие национальные сборные Беларуси, Дании, Словении и вторая сборная России. 10 ноября белорусская команда сыграет со Словенией, 11 ноября — с россиянами, 12 ноября — с датчанами.

Одним словом, все идет по плану, гомельские любители хоккея готовятся поболеть за наших. Но готовятся не только болельщики. Как же без “административного ресурса”?! К нам попало в руки письмо за подписью главы администрации Центрального района Гомеля О.Борисенко. Цитируем: “*Руководителю (согласно списку). В период 10—12 ноября в городе Гомеле состоится V Международный турнир по хоккею с шайбой “Кубок Полесья”, проходящий под патронажем Президентского спортивного клуба и председателя Гомельского облисполкома Дворника В.А., где на ледовой арене встретятся сборные команды Беларуси, России, Словении, Дании. Во исполнение поручения председателя Гомельского горисполкома Пилипца В.И. администрация Центрального района города Гомеля просит обеспечить приобретение билетов и явку зрителей на следующие игры турнира в количестве, не менее указанного в приложении”.*

АДМІНІСТРАЦЫЯ Цэнтральнага раёна

АДМИНИСТРАЦИЯ Центрального района

Руководителю (согласно списку)

В период 10 – 12 ноября 2011 года в городе Гомеле состоится V Международный турнир по хоккею с шайбой «Кубок Полесья», проходящий под патронажем Президентского спортивного клуба и председателя Гомельского облисполкома Дворника В.А., где на ледовой арене встретятся сборные команды Беларуси, России, Словении, Дании.

Во исполнение поручения председателя Гомельского горисполкома Пилипца В.И. администрация Центрального района города Гомеля просит обеспечить приобретение билетов и явку зрителей на следующие игры турнира в количестве не менее указанного в приложении.

Информацию о приобретенных билетах необходимо предоставить в администрацию Центрального района города Гомеля до 04 ноября 2011 г. по факсу: 74 38 40.

Глава администрации О.Л.Борисенко

Вот ведь сколько всего нового узнаешь! Я бы, например, никогда не догадался, что международный “Кубок Полесья” находится под “патронажем” председателя Гомельского облисполкома В.А.Дворника. Ведь на сайте Федерации хоккея Беларуси написано, что “организаторами турнира “Кубок Полесья” выступают: Ассоциация “Федерация хоккея Республики Беларусь”, Министерство спорта и туризма Республики Беларусь, РГОО “Президентский спортивный клуб” и Гомельский областной исполнительный комитет”. О товарище Дворнике — ни-ни. Забыли, наверное.

Но даже не это главное. Просто мы опять наступаем на старые грабли, когда благую идею стараемся превратить в показуху.

Помнится, относительно не так давно в Минске проходил юношеский чемпионат мира по хоккею. Так вот запомнилось, что на одном из матчей экс-президенту Федерации хоккея России Александру Стеблину, являвшемуся главой оргкомитета того чемпионата, вместе с полномочным главой польской хоккейной федерации Здиславом Ингилевичем не нашлось места в ложе для официальных лиц в столичном Дворце спорта. Потому что там уже находились VIP-персоны подросткового возраста из категории “директивного наполнения”, которые на увещевания солидных хоккейных функционеров заученно твердили: “Нам сказали садиться, где хочем”.

“Популяризация хоккея? — писал тогда “Прессбол”. — *Ну, во-первых, принудиловкой заставить полюбить нельзя. Как нельзя добиться любви изнасилованием — эффект будет гарантированно противоположным. Во-вторых, какая, мильпардон, популяризация, если для половины “настоятельно приглашенных” посещение хоккея ограничивается двухчасовым топтанием на крыльце арены — мест-то нет. У нас же лучше перебдеть, загонять — так с размахом... “Настоятельно пригласив” ко Дворцу количество зрителей, лишь немного уступающее вместимости арены. Неудивительно, что солидная их часть осталась по ту сторону дверей от трибун. Вместе с теми искренними болельщиками, которые так и не нашли друзей, знакомых или, на худой конец, “черных” билетеров. Но и попавшим “по разнарядке” было мало радости. Они, засветившись на одном периоде, предсказуемо стремились с обязаловки смыться, медленно растворившись в воздухе”.*

Вот и сейчас непонятно — почему так стараются гомельские чиновники “перебдеть”? Те, кто хочет на самом деле посмотреть хоккей, и сам не пожалеет денег, чтобы купить билет. Матчи с участием минского “Динамо” на родной арене — лишнее тому подтверждение. Но, наверное, показуха — это у белорусских чиновников в крови. Как бы чего не вышло. Не могут они иначе...

Алесь СВЕТЛАНИЧ.

НА ВЫСТАВУ!

Аляксей МАРАЧКІН: «Творца павінен быць свабодным»

Юбілейная выстава Аляксея Марачкіна (Алесь Мара), прысвечаная яго 70-годдзю, адкрываецца сёння.

Светапогляд творцы фарміраваўся ў час глухой ізаляцыйнай атмасферы сацрэалізму, метад якога тады лічыўся адзіна правільным, а вартасць твора вызначалася тым, наколькі ён дапамагае будаваць камунізм... Ужо ў пару вучобы мастак заяўляў пратэст супраць ідэалагічных ланцугоў. Пра гэта сведчаць яго раннія студэнцкія працы “На лесапавале” (1967), “Смаленне чорнага кабана” (1969), “Людзі і машыны” (1971).

Цяперашняя выстава называецца **“ЛОГІКА РУБЕРОЙДУ”.** На першы погляд, нязвыклае спалучэнне гэтых слоў не дае разгадкі іх патаемнага сэнсу. Як тлумачыць мастак, руберойд — першая частка слова *рубе* з лацінскай мовы азначае — чырвоны, *ройд* — від. Гэта ізаляцыйны будаўнічы матэрыял, які маскіруецца пад чорны ці карычневы колер, унутры якога закладзена *чырвань.* Логіка руберойду — аніякай логікі. Там, дзе чорны, — ён чырвоны, дзе чырвоны — на самай справе чорны, як глухая беспрасветная ноч. Чорная дзірка ў касмічнай прасторы...

Алесь Мара лічыць, што прадметам мастацтва можа быць усё. Якасць твора залежыць ад таленту і закладзенай энергетыкі аўтара. Выстава мае рэтраспектыўны характар. На сваім творчым шляху мастак перадусім імкнуўся, спасцігаючы новыя формы, выказаць найперш тое, што яго хвалюе. Ён лічыць, што творца ў першую чаргу павінен быць свабодным, без кантролю над сабой ані з якога боку. Ягоны нонканфармізм не ўсім даспадобы, некаторыя яго могуць абвінавачваць у залішняй палітызаванасці. У сваіх палотнах Аляксей Марачкін не абмінае вострых вуглоў нашага суіснавання, не разглядае мастацтва як утульнае мяккае крэсла дзеля камфорту.

На юбілейнай выставе прадстаўлены творы графічнага цыклу “Дзеячы гісторыі і культуры Беларусі”, інсталяцыя “Прасніцы размаўляюць”, маляваныя дываны, створаныя пад уплывам народна-ўжытковага мастацтва, пейзажы, партрэты, шматфігурныя кампазіцыі.

Адкрыццё выставы — 9 лістапада 2011 г. а 18-й гадзіне ў ВУП “Рэспубліканская мастацкая галерэя” ГА “Беларускі саюз мастакоў” (Палац мастацтва, вул.Казлова, 3, г.Мінск). Выстава працуе з 9 па 20 лістапада з 11.00 да 19.00 штодня, акрамя панядзелка.

Ірына ЛЯКСЕЕВА.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ: «У кожнага ёсць права выбару...»

*Днямі была ўзнагароджана званнем «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь» у мінулым выдатная спартсменка і проста цудоўны чалавек **Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.***

Сяміразовая чэмпіёнка свету па самба, пераможца студэнцкага сусветнага першынства па дзюдо, неаднаразовая чэмпіёнка свету па сумо. Цяпер — дзяржаўны трэнер па самба. Адным словам — вялікі чалавек!

“Доўгі час мне ніяк не даваўся тытул чэмпіёнкі СССР па дзюдо, — распавядала раней Вераніка Казлоўская журналістам аб сваім самым памятным медалі. — *Пачынаючы з 85-га, мне прадказвалі, што вось-вось я выйграю гэтае званне. Але яно ніяк не хацела ісці ў рукі. У 1986 годзе прыехала на чэмпіянат Саюза ў якасці фаварыткі. Аднак па ўласным глупстве адбылося тое, што адбылося, — давялося цешыцца ўсяго толькі “бронзай”. Першынство СССР 1987 года. Мэта ўжо побач, я дайшла да фіналу. І ў гэты час у маёй душы прачынаецца любоў да бліжняга — проста шкадуеш чалавека. Мая саперніца была траўміраванай. Атрымалася так, што падчас барацьбы схапіла яе за хворае калена, тая ўскрыкнула, і я адразу ж адпусціла. Справа ізноў скончылася “серабром”. І толькі ў 1988-м узяла вышыню! Колькі ж можна было спыняцца ў кроку ад мэты? Дайшла да фіналу, дзе мяне чакала Святлана Гундарэнка. А ў яе імяніны якраз у дзень паядынку, з нагоды чаго трэнер вынес у залу кветкі. Думаю: “Няўжо зноў не на маёй вуліцы свята?” Але сабралася і перамагла. Гэта і быў мой самы памятны медаль...”*

— Вераніка, віншуем вас! Доўга чакалі гэтага звання?

— Напэўна, што так.

— У свой час цяжка вам даўся пераход з вялікага спорту на пасаду спартыўнага чыноўніка?

— Дык гэта ж калі ўжо было! Хоць, натуральна, калі ты добра не ведаеш новай работы, то заўсёды складана. Спартсменам у гэтым плане прасцей. Ты прыехаў на спаборніцтвы, цябе размясцілі ў гасцініцы, сказалі, у колькі ўзважванне і спаборніцтвы. Выйшаў на дыван, зрабіў сваю справу і пайшоў. Нават і не думаеш, што нехта праводзіць нейкую арганізацыйную работу за цябе. А зараз вось самой даводзіцца гэтым займацца. І не тое што складана, а проста гэта ўжо, як кажуць, зусім з іншай оперы. Усюды ёсць свае плюсы і мінусы.

— З настальгіяй успамінаеце часы, калі выходзілі на татамі?

— О, не тое слова!

— А зараз не бывае жадання патрэніравацца, знайсці спарынг-партнёра?

— З маім пазваночнікам? Не жартуйце так. Траўмы ж пастаянна нагадваюць аб сабе. Гэта можа быць рэакцыя і на надвор’е, і проста так. З гэтым даводзіцца жыць.

— Многія вядомыя спартсмены казалі мне так: “Ніколі ў жыцці я не аддам сваё дзіця ў вялікі спорт. Гэта труна для здароўя...”

— Ведаеце, у кожнага ёсць сваё права выбару. На мой погляд, не бацькам вырашаць, чым займацца іх дзецям. Апошнія самі павінны выбраць, дзе яны найлепш могуць праявіць свае жыццёвыя здольнасці.

— Я не пра выбар, а пра здароўе, якога вялікі спорт дакладна не дадае. Ці гэта не так?

— Не дадае, але ў мяне з гэтай нагоды ёсць добры прыклад. Мая добрая сяброўка яшчэ па зборнай Савецкага Саюза, калі “завязала” з вялікім спортам, сказала так: “У гэтым спорце не будзе больш ні маёй нагі, ні нагі маіх дзяцей. У барацьбу я іх не аддам дакладна”. Прайшло шмат гадоў, падрасла дачка сяброўкі. Займалася танцамі, але раптам... пайшла на татамі. І маці таксама вярнулася ў спорт у якасці трэнера.

— Вам спорт у жыцці дапамог?

— Скажам так: усякае было.

— Са званнем вас ужо павіншавалі?

— Безумоўна.

— А вы сябрам “паляну” накрылі?

— Пакуль не час “паляны” накрываць. 10 лістапада каманда адпраўляецца на чэмпіянат свету...

Алесь СІВЫ.

Каб помнілі...

Федэрацыя хакея Беларусі аб’явіла аб аднаўленні работы дабрачыннага рахунку ў падтрымку сем’яў загінуўшых 7 верасня ў авіякатастрофе ў складзе хакейнай каманды яраслаўскага “Локомотива” нашых суайчыннікаў — абаронцы Руслана Салея, форварда Сяргея Астапчука і трэнера па фізпадрыхтоўцы Мікалая Крываносава, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Як інфармуе афіцыйны сайт ФХРБ, сабраныя грошы пойдуць на ўстаноўку помнікаў на магілах хакеістаў. Таксама плануецца ўзвядзенне скульптуры ў памяць аб Руслану Салею. Манумент будзе ўстаноўлены каля адной з лядовых арэн Мінска.

Акрамя таго, нацыянальная федэрацыя хакея сумесна са спартыўным парталам Goals.by праводзіць акцыю “Помнік для Салея”. Для таго каб стаць яе ўдзельнікам, трэба набыць майку з выявай былога капітана зборнай Беларусі. Усе сродкі, атрыманыя ад продажу маек, будуць накіраваны на дабрачынны рахунак ФХРБ, якая ўзяла на сябе абавязацельствы па ўзвядзенні помніка для легендарнага хакеіста. Цяпер майкі можна набыць у магазіне на стадыёне “Дынама-Юні”, які знаходзіцца па адрасе: Кунцаўшчына, вул.Вышалескага, 4А. Кошт адной майкі — 100 тысяч беларускіх рублёў.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ШАШКІ

Камбінацыя ў задачы

“У газеце “Народная Воля” за 13—15 кастрычніка 2009 года ў заметцы “Задача стогадовай даўніны” надрукаваны твор Іванова. Аднак у кнізе Бляніна (Масква, 1958) сцвярджаецца, што ўпершыню задача ўбачыла свет не ў 1909 годзе, а ў 1902-м”,— удакладняе мінчанін Аляксандр Біклаў. Заадно для **бліца-76/3** ён даслаў упадабаную ім задачу М.М.Пустыннікава (“64”, 1934):



Белыя: f2, f4, g3, g5, дамкі a7, c5, d4 (7). **Чорныя**: h8, дамкі b6, h2 (3). Замкнуць дамку і простую чорных.

Галоўны элемент

Калі ў задачах камбінацыі можа і не быць, бо для запірання чужых альбо сваіх фігур дастаткова адных ціхіх хадоў, дык у шашачных праблемах яна з’яўляецца галоўным элементам. Пераканайцеся ў гэтым на наступных прыкладах:

1.**Белыя**: 15, 18, 20, 22, 25, 27, 29, 34, 37, 38 (10). **Чорныя**: 5, 7, 9, 10, 11, 13, 14, 19, 35 (9). Ход чорных — нічыя белых (кааператыўная праблема): 1...11—17 2. 22:2 3. 15:13 4. 2:10! 5. 34—29 (4—9A) 6. 20 (10) 7. 15 (10—14) 8. 24! (13) 9. 20 10. 10=. A5...35—40 6. 23 (44) 7. 18 (49) 8. 12! (9) 7=.

2.**Белыя**: 18, 19, 31, 33, 38, 39, 42, 47, 48 (9). **Чорныя**: 4, 5, 7, 8, 9, 26, 30, 37, дамка 20 (9). Дамачная праблема: 43, 34, 1 (42A) 38, 23 (9/4—10) 41/46 (14, 14) 33x. A(37) 23, 38 (9/4—10, 14, 14) 33 (19/20) 29x.

3.**Белыя**: 9, 13, 14, 15, 16, 19, 23, 29, 41, 45 (10). **Чорныя**: 5, 6, 7, 17, 22, 27, 31, 32, 34, 36, 40 (11). Звычайная праблема: з першым пераможным ходам белых і без дамак у пачатковай расстаноўцы легальнасць даказваецца. Разгледзьце яе самастойна.

***

Чакаем адказы на працягу двух тыдняў па адрасе**: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а, рэдакцыя газеты “Народная Воля”, рубрыка “Шашкі”.**

Рашаем разам

Бліц-76/2 (Д.Камчыцкі): hg5!! (f:h4A) ef6 (g:e5B) fg3, e:h8x. B(e:g5) fg3, e:h8x. A(F:d4) gf6 (g:e5C) fe3x. C(e:g5) fe3x.

Мікалай ГЛАДКІ.

Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а. Прыёмная: тэл. (017) 3286871. Тэл./факс рэкламнага аддзела: (017) 3286904, 3286906 nv@promedia.by http://www.nv-online.info http://twitter.com/narodnaya_volya

ISSN 2071-9647

Падпісныя індэксы: 63222, 632222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб’явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 8.11.2011 у 17.00. Аб’ём 4 друк. аркушы. Тыраж 30050 экз. Заказ №5357.